Тэрмін «дзеці, якія часта хварэюць», — не захворванне і не дыягназ. У кожным выпадку неабходна высвятляць прычыну частых ВРІ, паколькі ад гэтага залежыць комплекс рэабілітацыйных мерапрыемстваў. СТАР 6

Сярод нашых чытачоў шмат тых, хто дасылае апавяданні на конкурс «Звязды». І сярод нашых аўтараў і чытачоў ёсць людзі, якія з дапамогай гэтага конкурсу вырастаюць у самастойную творчую асобу. СТАР 6

Падставай для самагубства ў псіхічна здаровага чалавека можа быць жаданне пазбавіцца ад невыноснага душэўнага болю і цяжкіх перажыванняў або дамагчыся жаданага ад навакольных. СТАР 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 СТУДЗЕНЯ 2013 г. СЕРАДА № 18 (27383) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЗС БЕЛАРУСІ: АСНОЎНУЮ ЎВАГУ — ЗНЕШНЕЭКАНАМІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Прыярытэтным напрамкам дзейнасці Міністэрства замежных спраў Беларусі ў 2013 годзе будзе знешнеэканамічная. Аб гэтым Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку 29 студзеня далажыў міністр замежных спраў Уладзімір Макей.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў далажыць аб тых праблемах, якія існуюць у Міністэрстве. «Мінула нямала часу пасля назначэння вас міністрам замежных спраў. Лічу, што тыя праблемы, якія існуюць у МЗС, ужо відаць. Я хацеў бы, каб вы іх хаця б схематычна абазначылі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу на адносіны Беларусі з партнёрамі на Захадзе і Усходзе. «Што ў нас адбываецца на восі Усход-Захад? Мяне цікавіць больш заходняя праблематыка, тым не менш напярэдадні Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, магчыма, ёсць пытанні і на ўсходнім напрамку ў плане АЭП і Расійскай Федэрацыі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнту было даложана аб планах работы Міністэрства замежных спраў у гэтым годзе і на бліжэйшую перспектыву, сфарміраваных з улікам установак кіраўніка дзяржавы.

Беларускім знешнепалітычным ведамствам зацверджаны заданні загранустановам па забеспячэнні экспарту, інвестыцый у Беларусь, узгодненыя з галінамі і рэгіёнамі. Паводле слоў міністра, заданні вельмі напружаныя, і МЗС прыкладзе ўсе намаганні для таго, каб іх выканаць. Практычна дзве трэці ўсіх мерапрыемстваў і ўсёй увагі ў рабоце міністэрства будзе ўдзелена прыярытэтнаму напрамку — знешнеэканамічнай дзейнасці.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ўсе прагнозныя паказчыкі павінны быць безумоўна выкананы. Аляксандр Лукашэнка мае намер летам гэтага года сустрэцца з кіраўнікамі загранустаноў Беларусі, пракантраляваць, як выконваюцца гэтыя прагнозныя паказчыкі, і паставіць задачы на перспектыву.

Закраналася пытанне перспектывы ўзаемаадносін Беларусі з Еўрапейскім саюзам, Злучанымі Штатамі Амерыкі. Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў шэраг прапаноў МЗС Беларусі, накіраваных на далейшую актывізацыю работы з еўрапейскімі партнёрамі.

Акрамя таго, былі абмеркаваны прапановы па некаторых кадравых пытаннях, у цэлым падтрыманыя Прэзідэнтам.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

ДОБРАЯ БАЛЬНІЦА — У ДОБРЫХ РУКАХ

Фотарэпартаж з самай «маладой» райбальніцы

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Самай «маладой» бальнічнай установе ў Беларусі толькі... 80 дзён. Знаходзіцца яна ў гарадскім пасёлку Шаркаўшчына і мае статус «цэнтральная раённая бальніца». Паколькі слову «маладая» часта надаецца больш шырокі сэнс, не будзе перабольшваннем сказаць, што гэта і самая прыгожая з медустаноў. Напрошваюцца і іншыя параўнанні: самая сучасная, камфартабельная, светлая. А што ўжо цёплая, утульная — ад чаго ў захапленні матулі з дзецьмі і хворыя старэйшага ўзросту...

Але, якія эпітэты ні ўжывай, без добрых спецыялістаў, пяшчотных рук і чулых сэрцаў людзей у белых халатах хвораму чалавеку не будзе хапаць ні таго ж камфорту, ні душэўнага спакою, ні ўпэўненасці ў хуткім выздараўленні. У бальніцы захаваны асяродак выдатных кадраў, пажыццёва аддадных абранай прафесіі. Адзін з гэткіх кадраў — галоўная медсястра бальніцы Валянціна Хаданёнак (на фотаздымку). У яе працоўнай кніжцы толькі адзін запіс, зроблены трыццаць гадоў таму. А пацвярджэннем прафесійнага майстэрства Валянціны Іванаўны з'яўляецца таксама і званне лепшага арганізатара сястрынскай справы, атрыманае на адным з абласных конкурсаў. СТАР 3

ЛІЧБА ДНЯ

Br4,6 млн

складзе кошт квадратнага метра агульнай плошчы жылога памяшкання тыпавых спажывецкіх якасцяў у Мінску. Гэты паказчык неабходны для разліку памеру льготных крэдытаў і аднаразовых субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў. Сярэдні кошт 1 кв.м жылля, уведзенага ў эксплуатацыю ў сталіцы ў 2012 годзе за кошт усіх крыніц фінансавання, склаў Br4 млн 366,9 тыс. Кошт квадратнага метра, пабудаванага з дзяржпадтрымкай, у сярэднім склаў Br3 млн 722,9 тысячы. На 2013 год гораду даведзена заданне пабудаваць 1 млн кв.м жылля, у тым ліку для тых, хто стаіць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — 760 тыс. кв.м жылля, з іх з дзяржпадтрымкай — 450 тыс. кв.м.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.01.2013 г.

Долар ЗША	8650,00	▲
Еўра	11620,00	▲
Рас. руб.	287,00	▲
Укр. грыўня	1064,62	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 2°
Віцебск	– 5°
Гомель	– 6°
Гродна	+ 2°
Магілёў	– 5°
Мінск	– 2°

СПАРТЫЎНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ БУДУЦЬ УВЕСЬ ЧАС ВІСЕЦЬ НА ШЫІ ДЗЯРЖАВЫ

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе аб мерах дзяржаўнай падтрымкі спартыўных арганізацый, перадае БЕЛТА.

«Я не хацеў бы, каб гэта нарада ператварылася ў чарговае выбіванне грошай для спартыўных арганізацый, клубаў і спартсменаў на гэты год або нейкі будучы перыяд. Вось гэта выкіньце адразу з галавы, гэтага не будзе», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў яго ёсць абгрунтаваныя сумненні ў тым, што чыноўнікам ад спорту ўдалося забяспечыць выкананне ўсімі арганізацыямі галіны сваіх абавязацельстваў па ўказу Прэзідэнта аб падтрымцы фізічнай культуры і спорту. «Тады мы выпрацавалі нейкую формулу падтрымкі клубаў, накіраваную, найперш, на стымуляванне самастойнага заработку сродкаў спартыўнымі арганізацыямі. Дзяржаўнае фінансаванне было вырашана прывязаць да вынікаў канкрэтнага клуба, калектыву і спартсмена», — сказаў Прэзідэнт. У якасці важнага напрамку была абазначана работа па фінансаванні дзіцяча-юнацкага спорту і развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Згодна з указам, органы ўлады на месцах павінны былі кантраляваць выкарыстанне дзяржаўнай падтрымкі ў спорце. «І не проста кантраляваць, але і прымаць меры па павелічэнні даходаў ад уласнай фінансава-гаспадарчай дзейнасці шляхам давядзення адпаведных заданняў да спартыўных арганізацый», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Тым не менш, далёка не ўсе палажэнні ўказа аказаліся выкананымі. «У мяне ёсць папярэднія вынікі планавай праверкі 9 клубаў па гульнявых відах спорту і маніторынгу выканання ўказа, прадстаўленыя Камітэтам дзяржкантролю. І яны, шчыра скажу, не ўражваюць, — адзначыў Прэзідэнт. — Не ўсе клубы сёння гатовы да самастойнай работы па прыцягненні пазабюджэтных крыніц фінансавання. Адсюль — складанасці ў развіцці сваёй матэрыяльна-тэхнічнай базы і ў аказанні дапамогі дзіцяча-юнацкаму спорту». А без гэтага, на думку Прэзідэнта, нельга разлічваць на дасягненне вынікаў. «І няхай не спадзяюцца ўвесь час вісець на шыі ў дзяржавы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка наконт аказання падтрымкі спартыўным арганізацыям.

Прэзідэнт лічыць, што мясцовыя ўлады са свайго боку не забяспечылі належны кантроль за дзейнасцю спартыўных арганізацый. «Як мне дакладваюць, адысці ад заганнай практыкі, калі за каштарыс ніхто не адказвае, да гэтага часу не ўдаецца», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што Мінспорту неабходна дакладна абазначыць прыярытэты развіцця спорту ў краіне і кантраляваць іх рэалізацыю на месцах. СТАР 2

Канстанцін СУМАР:

«У ГОД БЕРАЖЛІВАСЦІ БУДЗЕМ БЕРАГЧЫ І КНІГУ»

На Брэстчыне апошнім часам шмат робіцца для падтрымкі літаратуры, мастацтва, творчых асоб і іх пачынанняў. Пра гэта — наша гутарка са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Канстанцінам СУМАРАМ.

— Для пачатку прапаную крыху пагаварыць пра вынікі Года кнігі ў вобласці. Якія яны?

— Калі казаць пра Год кнігі, то трэба адзначыць, што ў вобласці ладзілася шмат цікавых мерапрыемстваў, праектаў і пачынанняў. Гэта святы і выставы кнігі, прэзентацыі навінак літаратуры, сустрэчы з аўтарамі і выдаўцамі, разнастайныя акцыі кшталту «Падары бібліятэцы кнігу», «Перачытаем класіку», «Чытаем па-беларуску». Былі таксама конкурсы і віктарыны, тэатралізаваныя прадстаўленні, а дзве раённыя бібліятэкі — у Бярозе і Жабінцы — нават паспрабавалі правесці «Ноч у бібліятэцы».

Праводзіліся не толькі літаратурныя мерапрыемствы, але і вяліся рамонт, рэканструкцыя, абнаўленне некаторых бібліятэк і ўстаноў культуры. Так, на мадэрнізацыю Брэсцкай цэнтральнай гарадской бібліятэкі з гарадскога бюджэту было выдаткавана каля 5 мільярдаў рублёў.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Нядаўна адкрыліся абласная філармонія і інтэрнат для навучэнцаў Баранавіцкага музычнага каледжа, адкрыты сялянскі падворак пры музеі «Бездзежскі фартушок» у Драгічынскім раёне, распачата рэканструкцыя тэатра лялек. Новы будынак у канцы года атрымала Драгічынская дзіцячая школа мастацтваў. Рэканструкцыя будынка абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага абыдзецца вобласці прыкладна ў 50 мільярдаў рублёў. Летась ужо пачаўся рамонт унутраных камунікацый бібліятэкі.

— Асаблівы рэзананс у абласным цэнтры атрымала акцыя «Брэст чытае дзецям». Наколькі мне вядома, у адной з сустрэч удзельнічаў і губернатар...

— За такую ініцыятыву, відаць, варта падзякаваць супрацоўнікам абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага. Яны запрашалі вядомых людзей вобласці і горада на незвычайную сустрэчу з дзецьмі і іх бацькамі. СТАР 2

■ Прамая лінія

ДЭКЛАРАВАННЕ ДАХОДАЎ І ІНШЫЯ ПЫТАННІ ПАДАТКААБКЛАДАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

На пытанні, звязаныя з аплатай падаходнага падатку, падчас «прамой лініі» чытачам нашага выдання адкажа **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Святлана Аляксандраўна ШАЎЧЭНКА. «Прамая лінія» адбудзецца 31 студзеня, у чацвер, з 11.00 да 12.00** у рэдакцыі «Звязды». Нумары «прамой лініі»: **8 (017) 292 38 92, 8 (017) 292 38 21.** Папярэднія пытанні можна дасылаць на электронны адрас: zvarot@zvyazda.minsk.by.

■ Прамая лінія

АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ЖЫЛЛЁВАЙ ПАЛІТЫКІ

1 лютага, у пятніцу, з 11.00 да 13.00 у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам начальніка ўпраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандра Вітальевіча ГОРВАЛЯ. Начальнік упраўлення адкажа на пытанні рэгулявання сістэмы пастаноўкі на ўлік грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, пра новыя механізмы дзяржаўнай падтрымкі ў жыллёвым будаўніцтве, пра будаўніцтва жылля па дзяржзаказе і арэнднага жылля, а таксама на іншыя актуальныя пытанні жыллёвай палітыкі. Нумары «прамой лініі»: **8 (017) 292 38 92, 8 (017) 292 38 21.** Папярэднія пытанні можна дасылаць на электронны адрас: zvarot@zvyazda.minsk.by.

У лютым за электрычнасць і газ будзем плаціць па дыферэнцыяваных тарыфах

Адначасова кошт электраэнергіі для насельніцтва павялічваецца на 18%

Згодна з адпаведнай пастановай Саўміна, у Беларусі пачынае дзейнічаць трохступенчатая сістэма тарыфаў у залежнасці ад аб'ёмаў спажывання электраэнергіі і газу.

Цяпер для памяшканняў з электраплітой, пры штомесячным спажыванні да 250 кВт/г электраэнергіі, аплата будзе ажыццяўляцца па базавых тарыфах. Калі спажыванне электрычнасці будзе ў межах ад 250 да 400 кВт/г уключна, то базавы тарыф павялічваецца на каэфіцыент 1,3, але не вышэй за такія тарыф, што цалкам пакрываюць эканамічна абгрунтаваныя затраты на аказанне паслуг электразабеспячэння. А вось калі электрычнасці будзе спажыта больш за 400 кВт/г у месяц, то аплата будзе ажыццяўляцца па тарыфах, якія цалкам пакрываюць затраты на аказанне такіх паслуг.

У дамах без электрычных пліт прадугледжана аналагічная сістэма аплаты. Цяпер пры штомесячным спажыванні да 150 кВт/г электрычнасці дзейнічае базавы тарыф, ад 150 да 300 кВт/г уключна — па тарыфах з каэфіцыентам росту 1,3, а звыш 300 кВт/г — па тарыфах, што цалкам пакрываюць затраты. СТАР 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МІНІСТР АБАРОНЫ ЕГІПТА ЗАСЦЕРАГАЕ АД РАЗВАЛУ КРАІНЫ

Міністр абароны Егіпта, генерал-палкоўнік Абдэль Фатах аль-Сісі 29 студзеня выступіў з афіцыйнай заявай, у якой папярэдзіў аб магчымым развале краіны ў выпадку працягу бягучага палітычнага крызісу.

«Працяг барацьбы за ўладу паміж рознымі палітычнымі сіламі можа прывесці да калапсу дзяржавы як такой», — сказаў генерал. Паводле яго слоў, вайсковыя падраздзяленні ўжо разгорнуты каля жыццёва важных аб'ектаў краіны, каб не дапусціць іх захопу або пашкоджання. Раней армія заяўляла аб сваім поўным нейтралітэце і неўмяшанні ў палітычны канфлікт, таму жорсткую заяву генерала многія ўспрынялі ў якасці папярэджання аб небяскончым цярпенні войска.

МІНІСТР ПРАЦЫ НАЗВАЎ ФРАНЦЫЮ БАНКРУТАМ

Міністр працы Францыі Мішэль Сапен абвясціў краіну банкрутам. «Францыя — усё яшчэ дзяржава, але гэта дзяржава-банкрут. Менавіта таму нам неабходна прыняць план скарачэння выдаткаў бюджэту, і нішто не павінна адвярнуць нас ад гэтай мэты», — заявіў міністр. Заяву аб банкруцтве падхапілі палітычныя аналітыкі, і навіна трапіла на першыя палосы газет. Ва ўрада Францыі ёсць сур'ёзныя праблемы, якія звязаны з адтокам капіталу з краіны. Мільянеры і мільярдэры ратуюць сваё багацце ад буйных падаткаў, якія ўвялі сацыялісты, і бягуць у суседнія краіны. Ва ўмовах уцёкаў мільянераў урад Аланда вымушаны прымаць меры па скарачэнні дэфіцыту бюджэту. Эканамічная бязладзіца ўрада Аланда адбываецца на фоне складанай сітуацыі ў былой французскай калоніі — Малі.

У ЗША ЎПЕРШЫНЮ З 2010 ГОДА КАРАЮЦЬ СМЕРЦЮ ЖАНЧЫНУ

Першая з 2010 года жанчына будзе пакарана ў Тэхасе. Кімберлі Макарці была асуджана за рабаванне і забойства сваёй 71-гадовай суседкі Дораці Бут. Тры тыдні таму 51-гадовай Макарці было адмоўлена ў пераглядзе справы, нягледзячы на апеляцыі яе адвакатаў да таго, што прысуд быў расава матываваны (толькі 1 з 12 прысяжных, якія працавалі на судзе супраць чарнаскурай Макарці, быў афраамерыканцам). Як паведамляюць СМІ, ёсць падставы меркаваць, што Макарці забіла яшчэ дзвюх пажылых жанчын, адну з іх — малатком для адбівання мяса.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

НАВУКОЎЦЫ ЗНАЙШЛІ АДКАЗ, ЯК ПАДОЎЖЫЦЬ ЖЫЦЦЁ ЧАЛАВЕКА ДА 500 ГАДОЎ

Навукоўцы з Аўстраліі выявілі дзіўную здольнасць слімакоў цалкам спыняць старэнне на час сваёй спячкі. Зараз эксперты збіраюцца шукаць гены, якія адказваюць за гэты працэс. Спецыялісты ўпэўнены, што пазітыўны эфект ад гэтых генаў можна ўжыць і ў дачыненні да чалавека. «Такім чынам, некаторыя слімакі могуць павялічваць працягласць свайго жыцця з 3 гадоў да 23. Калі перанесці гэта на чалавека, то яго працягласць вырасла б з 70 гадоў амаль да 500», — кажа малекулярны біёлаг з Універсітэта Саншайн Коаст доктар Скот Камінс.

Цяпер доктар Камінс спрабуе выявіць гены і нейрагармоны, якія выклікаюць сонны стан у слімакоў у летні перыяд, калі гэтыя жывёлы проста засынаюць на некалькі месяцаў у спякотным клімаце. Адзначаецца, што набор генаў чалавека амаль на 50% падобны на генны састаў слімакоў, таму не выключана, што і ў людзей ёсць «гены спячкі». Новае адкрыццё можа падарыць чалавецтву сродкі для тармажэння старэння і ўвядзення ў стан анабіёзу.

КОРАТКА

З 1 лютага ў Беларусі на 9,7 працэнта павышаюцца тарыфы на паслугі па транспарціроўцы нафты па сістэме магістральных трубаправодаў адкрытых АТ «Гомельтранснафта Дружба» і «Полацктранснафта Дружба» па тэрыторыі рэспублікі.

Беларусы з 20 снежня 2012 года па 28 студзеня 2013 года набылі валютных дзяржаблігацый на $45,3 млн, што складае 90,6 працэнта прапанаваных Міністэрствам фінансаў $50 млн.

Колькасць зарэгістраваных шлюбаў у краіне ў 2012 годзе зменшылася ў параўнанні з 2011-м на 12,1 працэнта, а колькасць разводаў павялічылася на 1,2 працэнта. Усяго ў 2012 годзе ў рэспубліцы зарэгістравана 76 тыс. 245 шлюбаў і 39 тыс. 34 разводы.

Захваральнасць на ВРІ ў Беларусі знаходзіцца на ўзроўні перадэпідэмічнага перыяду. Вынікі вірусалагічнага маніторынгу сведчаць аб спарадычнай цыркуляцыі вірусаў грыпу А і аб асацыяцыі рэспіраторных захворванняў з негрыпознымі рэспіраторнымі вірусамі. Сярод хворых пераважаюць дзеці — 57,8 працэнта.

■ Паслугі і цэны

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ ВОПРАТКІ І АБУТКУ

Калі-нікалі ў кожнага чалавека псуецца адзенне і абутак. Сярод самых распаўсюджаных непрыемнасцяў — зламаная «маланка», адарваная кнопка. Можа стацца і так, што з цягам часу вопратка ўжо «сядзіць» не так, як таго хочацца, а мяняць яе шкада. І тады на дапамогу прыходзяць швейныя і абутковыя майстэрні, дзе можна рэанімаваць любімыя рэчы. «Звязда» параўнала цэны на паслугі па рамонце абутку і адзення ў сталіцы, абласным цэнтры, аграгарадку і вёсцы.

АНТЫКРЫЗІСНЫ ПАДЫХОД

Рамонт адзення — папулярная бытавая паслуга ў Магілёве. Яна запатрабавана насельніцтвам, а попыт задавольваюць дзяржаўныя атэлье і, найбольш, прыватнікі.

Падгонка пад гандаль

— Паслуга па рамонце адзення з'яўляецца безумоўна запатрабаванай і актуальнай, — каментуе **галоўны спецыяліст аддзела бытавога абслугоўвання Магілёўскага абласнога ўпраўлення гандлю Вольга ЯНУКОВІЧ**.

Яна ілюструе сцвярджэнне ўласным прыкладам: Вольга карыстаецца паслугамі прыватніка, які працуе ў гандлёвым цэнтры непадалёк ад яе дома, і выдатна, за невялікія грошы, падганяе набытае новае адзенне.

— Мяне цэны задавальняюць, — кажа яна. — Яны розныя, у залежнасці ад аб'ёму і складанасці працы. Я плаціла каля 20 тысяч рублёў за тое, каб падкласці ніз, а калі новую сукенку практычна перашывалі па фігуры — 90 тысяч. Гэта нядорага.

У вялікіх гандлёвых цэнтрах Магілёва абавязкова знаходзіцца куток і для прыватнага прадпрымальніка, які прапануе швейныя паслугі. Там, дзе адзенне набываюць, зручна адразу падагнаць яго па фігуры. Любы прадавец на скаргу пакупніка на даўжыню штаноў ці складкі на таліі зробіць зніжку і параіць звярнуцца тут жа, на месцы, да майстра. З гэтай жа прычыны швейныя майстэрні ёсць і на рынках абласнога цэнтра — Віленскім і Грабянёўскім. СТАР 3

СПАРТЫЎНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ БУДУЦЬ УВЕСЬ ЧАС ВІСЕЦЬ НА ШЫІ ДЗЯРЖАВЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Выбудаваць работу такім чынам, каб тыя, хто паказвае высокія спартыўныя вынікі і нядрэнныя паказчыкі гаспадарчай дзейнасці, былі ў ліку першых атрымальнікаў дзяржаўнай падтрымкі», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка.

У час нарады Прэзідэнт запатрабаваў ад службовых асоб, адказных за развіццё спорту ў краіне, далажыць аб тым, ці дасягнуты мэты, закладзеныя ва ўказе аб падтрымцы спартыўных арганізацый, і якія захады трэба зрабіць для ўдасканалення ўмоў падтрымкі ў гэтай сферы. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што так званая «сяродняя тэмпература па бальніцы» яго не цікавіць. «Я хацеў бы і патрабую дэталёвай справаздачы, выходзячы з дзейнасці кожнай спартыўнай арганізацыі. Прыхарашыць агульную карціну за кошт толькі часткі паспяховых і дзейных сёння ўжо не ўдасца», — падкрэсліў ён. Паводле яго слоў, улічваючы нагрузку, якую нясуць бюджэт і беларускія прадпрыемствы, аказваючы дапамогу спорту, дзяржава не можа закрываць вочы на невыкананне чыноўнікамі ад спорту шэрагу сваіх абавязацельстваў.

...За электрычнасць і газ будзем плаціць па дыферэнцыяваных тарыфах

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па дамах, якія не абсталяваны электраплітамі і сістэмамі цэнтралізаванага гарачага забеспячэння і забеспячэння прыродным газам, пры спажыванні да 300 кВт/г уключна, прадугледжваецца аплата па базавым тарыфе, а калі звыш 300 кВт/г — то тарыф павялічваецца на каэфіцыент 1,3.

Пастанова Саўміна ўдакладняе, што такі парадак аплаты не распаўсюджваецца на шматдзетныя сем'і і дзіцячыя дамы сямейнага тыпу; сем'і, якія выхоўваюць дзяцей, дзе бацькі ў поўнай сям'і (бацька ці маці ў няпоўнай сям'і) з'яўляюцца інвалідамі I і II груп, а таксама калі адзін з бацькоў з'яўляецца інвалідам I групы, а другі ажыццяўляе яго догляд і атрымлівае дапамогу. Дыферэнцыяваная сістэма не датычыцца няпоўных сем'яў, якія выхоўваюць дзіця-інваліда; грамадзян, якія ажыццяўляюць разлікі па дыферэнцыяваных з часавымі перыядамі тарыфах. Не распаўсюджваецца новая сістэма і на аб'ёмы электраэнергіі, якая спажываецца стацыянарна электрапрыёмнікамі (электракатламі) з магутнасцю больш за 5 кВт для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння.

У Мінэнерга ўдакладнілі, што дыферэнцыяваная аплата насельніцтвам паслуг электра- і газазабеспячэння ў залежнасці ад аб'ёмаў іх спажывання будзе прымяняцца без уліку колькасці зарэгістраваных у жылых памяшканнях грамадзян.

Па жылых дамах са шматтарыфнымі электроннымі прыборамі ўліку электрычнасці (з аўтаматызаванымі сістэмамі), аплата за электраэнергію можа ажыццяўляцца грамадзянамі па адной з прапанаваных сістэм на выбар. Або па дыферэнцыяваных па часавых перыядах тарыфах, ці з выкарыстаннем новай сістэмы аплаты, дзе прадугледжаны гранічныя аб'ёмы спажывання электрычнасці.

У жылых дамах (кватэрах), дзе адсутнічаюць прыборы індывідуальнага ўліку расходу электрычнасці, прадугледжана прымяняць максімальны тарыф, які цалкам пакрывае затраты на аказанне паслуг электразабеспячэння. Тут трэба адзначыць, што гэтая норма пачне дзейнічаць з 1 ліпеня 2013 года.

Пастановай прадугледжваюцца новыя падыходы і па аплаце насельніцтвам прыроднага газу. З 1 лютага па жылых дамах (кватэрах), дзе ёсць прыборы індывідуальнага ўліку расходу газу, аплата будзе спаганяцца штомесяц у залежнасці ад гадавых аб'ёмаў яго спажывання, згодна з нарастаючым вынікам штогод з 1 студзеня.

Цяпер базавы тарыф прадугледжаны для тых спажыўцоў, якія спальваюць не больш за 3 тысячы кубаметраў газу. Калі спажыванне газу на працягу года трапляе ў дыяпазон ад 3 да 5,5 тысячы кубаметраў, то базавы тарыф павялічваецца на каэфіцыент 1,3, аднак не больш за кошт поўнага пакрыцця затрат. А пры гадавым спажыванні газу больш за 5,5 тысячы кубоў пачынаюць дзейнічаць цэны, якія цалкам пакрываюць затраты на аказанне паслуг газазабеспячэння.

Новы парадак аплаты за газ не распаўсюджваецца на шматдзетныя сем'і і дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, а таксама і тых сацыяльных катэгорый ільготнікаў, што прапісаны пастановай Саўміна па аплаце электрычнасці.

У жылых дамах (кватэрах) без прыбораў індывідуальнага ўліку расходу газу, плата будзе спаганяцца па максімальных цэнах, якія цалкам пакрываюць затраты на аказанне паслуг газазабеспячэння. Гэта норма дзейнічае толькі за выключэннем тых выпадкаў, калі ўстаноўка прыбораў уліку тэхнічна немагчыма або эканамічна немэтазгодна. Вышэйназванае новаўвядзенне пачне выкарыстоўвацца з першых дзён ліпеня 2013 года.

Сяргей КУРКАЧ.

Новы кошт электрычнасці — плюс 18%

З першых дзён лютага электраэнергія ў жылых памяшканнях з электраплітамі па базавым тарыфе будзе каштаваць 324,9 руб. за 1 кВт/г (зараз — 274,4 руб.), па дыферэнцыяваных тарыфах — 227,4 руб. за 1 кВт/г у перыяд мінімальных нагрузак з 22.00 да 17.00 (зараз — 192,1 руб.) і 649,8 руб. за 1 кВт/г у перыяд максімальных нагрузак з 17.00 да 22.00 (сёння — 548,8 руб.).

Электрычнасць у жылых дамах (кватэрах) без электраплітаў па базавым тарыфе абыдзецца насельніцтву ў памеры 382,4 руб. за 1 кВт/г, па дыферэнцыяванай часавай шкале — 267,7 руб. за 1 кВт/г у перыяд мінімальных нагрузак з 22.00 да 17.00 (зараз — 226,1 руб.) і 764,8 руб. за 1 кВт/г у перыяд максімальных нагрузак з 17.00 да 22.00 (цяпер — 646 руб.).

«У ГОД БЕРАЖЛІВАСЦІ БУДЗЕМ БЕРАГЧЫ І КНІГУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Падчас імпрэзы кожны госць чытаў сваю любімую кнігу дзяцінства або любімую кнігу сваіх дзяцей ці ўнукаў, тым самым вяртаючы традыцыю сямейнага чытання. Стаць першым удзельнікам гэтага мерапрыемства арганізатары запрасілі кіраўніка вобласці. Ведаю, што акрамя мяне, у госці да дзяцей прыходзілі таксама рэктар Брэсцкага дзяржуніверсітэта, галоўны пракурор вобласці, дырэктар лялечнага тэатра і нават Дзед Мароз. І самае галоўнае, што ў 2013 годзе акцыю цяпер ужо «Брэстчына чытае дзецям» вырашылі падхапіць рэгіянальныя бібліятэкі.

— У бібліятэку на згаданую акцыю прыходзілі і брэсцкія пісьменнікі. А як на абласным узроўні ажыццяўляецца падтрымка літаратараў і іншых творчых асоб?

— З мноства прыкладаў такой падтрымкі засяроджуся на двух, найбольш, напэўна, знакавых для творчай грамады вобласці. Рашэннем абласнога выканаўчага камітэта ў чэрвені 2007 года заснавана літаратурная прэмія імя Уладзіміра Андрэевіча Калесніка, выдатнага пісьменніка Берасцейшчыны, прафесара, стваральніка і кіраўніка абласнога літаратурнага аб'яднання «Зараніца», лаўрэата Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа. Прэмія прысуджаецца за дасягненні ў галіне літаратуры, а таксама за высокі ўзровень майстэрства апублікаваных твораў у галіне літаратуры, якія ўзбагачаюць духоўнае жыццё і нацыянальную культуру рэгіёна. Спаборніцтва за атрыманне прэміі ажыццяўляецца па трох намінацыях: проза, паэзія і дзіцячая літаратура. Цырымонія ўручэння прэміі праходзіць ва ўрачыстай абстаноўцы ў рамках літаратурнага фестывалю «Лунінская восень».

З 2005 года мы праводзім таксама абласное штогадовае спаборніцтва сярод рэдакцый газет, тэлебачання і радыё, прафесійных журналістаў. Вынікі падводзяцца ў шэрагу намінацый. Пераможцы атрымліваюць дыпломы аблвыканкама і грашовыя прэміі. Узнагароджанне прымяркоўваецца звычайна да Дня друку.

Будзе вельмі кепска, калі мы страцім традыцыю вучыцца добраму з дапамогай літаратуры. Таму дарослыя не павінны шкадаваць намаганняў, каб прывіць дзецям ахвоту да чытання.

Гэтыя дзве акцыі ўжо сталі неад'емнай часткай творчага жыцця вобласці, своеасаблівым сведчаннем таго, што сёння Беларусь у сваім інтэлектуальным, творчым жыцці прыбаўляе якраз за кошт рэгіёнаў, якія далі і даюць яркіх асоб для духоўнага жыцця ўсёй краіны.

— Вы згадалі «Лунінскую восень». Такі фэст праводзіцца толькі ў Брэсцкай вобласці, і вырас ён з раённага свята літаратуры. Можа, яму пара перайсці ў ранг рэспубліканскага фестывалю?

— «Лунінская восень» — гэта характэрная прыкмета якраз берасцейскага духоўнага жыцця, своеасаблівая «разынка» нашай рэгіянальнай культуры і літаратуры. Выхад на рэспубліканскі ўзровень азначаў бы размыванне ў гэтым сэнсе ўласна берасцейскага элемента.

Акрамя таго, нельга сказаць, што «Лунінская восень» — свята рэгіянальна замкнёнае. У ім заўсёды прымае ўдзел даволі шырокае кола сталічных дзеячаў культуры і літаратуры. Да «Восені» штогод выходзіць спецыяльны «берасцейскі» нумар часопіса «Маладосць», які дае магчымасць пазнаёміцца з лепшымі творамі нашага рэгіянальнага пісьменніцкага кола ўсім, хто цікавіцца беларускай літаратурай.

— Ці мае намер абласная ўлада і далей спрыяць развіццю фестываляў «Белая вежа», «Студзеньскія музычныя вечары»?

— Безумоўна. Гэтыя фестывалі — наша візітная картка. Уявіць сённяшнюю Берасцейшчыну без іх проста немагчыма. Яны даўно сталі чаканымі і жаданымі для многіх аматараў мастацтва. На фестывалі выдаткоўваюцца даволі значныя грашовыя сродкі. Так, у 2012 годзе толькі з абласнога бюджэту было накіравана 280 мільёнаў рублёў на тэатральны фестываль «Белая вежа» і каля 450 мільёнаў рублёў — на фестываль «Студзеньскія музычныя вечары». У гэтай падтрымцы, я лічу, заключаецца значная функцыя абласной улады. Работу ў ідэйна-зместавым і мастацкім плане мы ажыццяўляем разам з прафесіяналамі, якія стараюцца зрабіць фестывалі прывабнымі для гледача. І гэта ім у значнай ступені ўдаецца, мяркуючы па цікавасці берасцейскай публікі.

Добрая паэзія, як і песня — магутны сродак барацьбы са стрэсамі. Калі бывае цяжка на душы, калі трэба ўтаймаваць эмоцыі, лепш за ўсё адкрыць любімую кнігу вершаў.

Хоць, будзем шчырымі, пэўныя заўвагі ёсць. Гэта было відаць і сёлета, калі і вашы калегі-журналісты, і звычайныя гледачы звярталі ўвагу арганізатараў на хібы і ў падрыхтоўцы, і ў падборы рэпертуару названых мерапрыемстваў. Дрэнна, што ўбаку ад арганізацыйных пытанняў засталіся абласное ўпраўленне культуры, абласная філармонія. Аддаючы даніну павагі арганізатару і артдырэктару «Вечароў» Лініі Батыравай, шануючы яе як аўтара самой ідэі правядзення такога свята, я ўсё ж такі лічу, што частку абавязкаў па арганізацыі фестывалю павінна ўзяць на сябе найперш наша абласная філармонія. Бо аднаму чалавеку часта проста немагчыма вырашыць той комплекс пытанняў, які паўстае падчас падрыхтоўкі і правядзення такога маштабнага мерапрыемства.

Адсюль і тыя дробныя прыкрасці, якія могуць псаваць уражанне ад падзеі, кшталту блытаніны з запрашэннямі або дыпломамі ўдзельнікам і мецэнатам. За канцэрты «Вечароў» гледачы плацяць немалыя грошы і таму маюць права патрабаваць да сябе адпаведнага стаўлення з боку арганізатараў.

Можа, я крыху захапіўся крытыкай, але ўпэўнены, што яна будзе ўспрынята адэкватна, адпаведныя высновы будуць зроблены, і ў наступным годзе справамі «Студзеньскіх вечароў», па прыкладзе «Белай вежы», нарэшце зойдзецца калектыў аднадумцаў.

Дарэчы, «Студзеньскія музычныя вечары» сёлета былі юбілейнымі. Брэст пабачыў іх дваццаць пяты раз. І не проста пабачыў, а дакрануўся да сапраўднага мастацтва, якое прэзентавалі дваццаць пяць краін.

У гэтыя дні мы змаглі адчуць сябе часткаю сусветнай сям'і народаў, хай сабе невялікай, але годнай і таленавітай. Слухаючы першую флейту міланскай «Ля Скала», падумаў, што прафесар Антоніа Амендуні ў пэўнай ступені аддае пашану нам, берасцейцам, якія ў свой час далі міланскай оперы саліста, чыё імя сёння вяртаецца ў нашу нацыянальную памяць — Міхаіса Забэйду-Суміцкага. Адзін прыклад, але ён шмат дае для разумення нашай знітаванасці з іншымі краінамі Еўропы і свету, для адчування сябе вартымі павагі як розных народаў, так і найперш саміх сябе.

— Канстанцін Андрэевіч, відаць, рэдкі вечар, прысвечаны адкрыццю альбо закрыццю названых фестываляў у апошнія гады прайшоў без вашага ўдзелу. Лічыце гэта неад'емнай часткай сваёй работы?

— Па-першае, сапраўднае мастацтва люблю. З'яўляюся паклоннікам як класічнай музыкі, так і тэатра. Таму з задавальненнем іду як глядач. Але самае галоўнае, што ўдзел губернатара ў такім мерапрыемстве дазваляе падкрэсліць значнасць для рэгіёна той ці іншай культурнай падзеі. І гэта ўжо разглядаю як свой абавязак.

— А якія кнігі пакінулі адметны след у вашым жыцці? Якую літаратуру чытаеце? Якіх аўтараў любіце?

— Люблю творы гістарычнай тэматыкі. Першынство тут аддаю Уладзіміру Караткевічу, а калі канкрэтней, раману «Каласы пад сярпом тваім». Шкада, што задумка экранізаваць кнігу, як гэта планавалася раней, адкладзена. Такі твор даўно варты ўвасаблення на экране.

Калі ж гаварыць больш шырока пра літаратурныя перавагі, то гэта найперш творы XX стагоддзя, на якіх расло маё пакаленне: «Палеская хроніка» Івана Мележа, «Сэрца на далоні» Івана Шамякіна, «Ціхі Дон» Міхаіла Шолахава, паэзія Сяргея Ясеніна. Гэта аўтары, якія зрабілі вялікай літаратуру XX стагоддзя.

— Даўно заўважыла, што вы любіце паэзію. На вечарыне ў гонар юбілею Яўгеніі Янішчыц у Пінску вы выйшлі на сцэну і пачалі выступленне з цудоўных радкоў паэтэсы, спаслаўшыся на свежы нумар «Звязды», дзе верш быў надрукаваны. Часта падчас уручэння згаданай літаратурнай прэміі цытуеце нешта з аўтара, які ўганараваны. Відаць, робіце для сябе выпіскі на памяць, нешта пакідаеце з заўважанага, адметнага?

— Так, і выпісваю, і пакідаю закладкі ў кнізе, з газеты магу выразаць, калі прыгожы радок закранае. Добрая паэзія, як і песня — магутны сродак барацьбы са стрэсамі. Калі бывае цяжка на душы, калі трэба ўтаймаваць эмоцыі, лепш за ўсё адкрыць любімую кнігу вершаў, якую, дарэчы, заўсёды трымаю недалёка.

— Чаму, на ваш погляд, чалавеку трэба чытаць заўсёды, нягледзячы на ўзрост, пасаду, узровень адукацыі?

— Таму што гэта адзін са шляхоў самаўдасканалення. Чытанне выпрацоўвае логіку, цэласнасць мышлення. Чытаць трэба, каб не закасцянець у поглядах, не згубіцца ў чарадзе лічбаў, стэрэатыпаў, штодзённасці. У таленавітых творах люблю чытаць апісанне прыроды. Яно вельмі рознае, часта праз яго аўтар нейкім чынам праводзіць ацэнку герояў ці падзей. І вось, бывае, лаўлю сябе на думцы, што гэтае апісанне прымяраю нейкім чынам на асобных людзей ці з'явы. І ўсё гэта прыносіць пэўнае душэўнае задавальненне. Так мы, тыя, хто са школьных гадоў прывык да чытання, кампенсуем свой духоўны голад.

— Але як навучыць усяму гэтаму дзяцей?

— Цяпер гэта вялікая праблема. Абмяркоўваў яе з бібліятэкарамі, бацькамі падчас кніжнага мерапрыемства. Усе адзначаюць, што камп'ютар рашуча перакрыгвае на сябе ўвагу юных. Яны атрымліваюць шмат інфармацыі, а напісаць, скажам, добрае сачыненне не могуць, бо не чытаюць, не ўмеюць паслядоўна выкладаць свае думкі. Будзе вельмі кепска, калі мы страцім традыцыю вучыцца добраму з дапамогай літаратуры. Таму дарослыя не павінны шкадаваць намаганняў, каб прывіць дзецям ахвоту да чытання. Сваіх унукаў Косцю і Яраслава — я ўвесь час падштурхоўваю да думкі, што сучаснаму чалавеку важна быць чытачом. Калі выпадае час, абавязкова стараюся пайсці з імі ў лес. Сярод жывой прыроды найлепш гутарыць пра адносіны да з'яў, да людзей, да жыцця наогул — і да кніг. Старэйшы з іх — школьнік, а малодшаму зараз шэсць гадоў. Па-мойму, самы час пачынаць абуджаць інтарэс да кнігі.

Мне вельмі хацелася б, каб сённяшняя моладзь, нягледзячы на ўсе спакусы сучаснасці, захавала тую павагу і цікавасць да кнігі, якія былі ўласцівы старэйшаму пакаленню. Таму ў Год беражлівасці давайце берагчы і шанаваць кнігу!

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ТРОЙЧЫ ПЕРАМОЖЦЫ!

Міністэрства эканомікі падвяло вынікі чарговага конкурсу на лепшае асвятленне і прапаганду ў СМІ прадпрымальніцкай дзейнасці ў 2012 годзе. У намінацыі «Дзяржаўная палітыка ў сферы малога прадпрымальніцтва» сярод рэспубліканскіх перыядычных выданняў лепшай была зноў прызнана газета «Звязда». Дарэчы, наша газета перамагае ў гэтым конкурсе ўжо трэці год запар.

У іншых катэгорыях перамаглі калегі з АНТ, телерадыёкампаніі «Гомель», канала «Гродна плюс», «Народнай газеты», «Белорусской нивы», а таксама некаторых рэгіянальных выданняў.

Аляксандр Груздоў, дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі, падчас уручэння ганаровых грамат пераможцам адзначыў, што ўсе тыя працэсы па лібералізацыі эканомікі, якія адбываюцца ў Беларусі, у поўнай ступені знаходзяць сваё адлюстраванне ў беларускіх сродках масавай інфармацыі. Таксама ён дадаў, што ўсе падзеныя на конкурс матэрыялы (каля 100 заявак) былі вельмі высокага ўзроўню, таму журы было не так проста вызначыць пераможцаў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр транспортной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Дорорс» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:

Лот № 1:

здание специализированное для общественного питания (кафе «Встреча друзей»), инвентарный номер 500/С-38412, об. пл. 246,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 103 А, в том числе дворовые сооружения, включенные в технический паспорт.

Начальная цена с НДС – 2 663 024 880 бел. руб.

Здание расположено на земельном участке пл. 0,0981 га, предоставленному продавцу на праве временного пользования по 31.03.2021 с ограничениями в использовании: охранная зона водоводов, пл. 0,0046 га; охранная зона канализации, пл. 0,0112 га; водоохранная зона и прибережные полосы (зоны) вдх. Лошица, пл. 0,0981 га; обеспечение доступа эксплуатационным организациям-владельцам инженерных коммуникаций для производства ремонтно-восстановительных работ, пл. 0,0981 га.

Лот № 2:

изолированное помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения (центр красоты и здоровья), инвентарный номер 500/D-7127094, об. пл. 983,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 9, корп. 2, пом. 3 Н.

Начальная цена с НДС – 17 313 228 000 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с 3012 344 930 017; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на следующие счета: в евро (EUR) – 3012 344 935 025; в долларах США (USD) – 3012 344 935 012; в российских рублях (RUB) – 3012 344 935 038 – в отделении № 507 гор. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191 284 787, получатель платежа: ЗАО «Центр транспортной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.ctocenka.by**.

Аукцион состоится 01.03.2013 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, офис 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 27.02.2013 до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: **+375 17 268 05 70; +375 29 183 69 71.** E-mail: **auction@ctocenka.by**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырская торговая компания «Полесье» (продавец)

извещает о проведении 04 марта 2013 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Начальная цена продажи имущества одним лотом, с учетом НДС бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	**Здание одноэтажного кирпичного магазина № 56, инв. № 330/С-7946 площадью 61,2 кв.м.**	Гомельская обл., г. Мозырь, ул. 17 Сентября, 58А	94 350 720	96 463 680	9 600 000
	Многолетние насаждения в количестве двух деревьев (берез)		2 112 960		

Продавец: Открытое акционерное общество «Мозырская торговая компания «Полесье», 247760, г. Мозырь, ул. Ветровая, 21, тел. 8(0236) 37 67 39.

Шаг аукциона – 5% от начальной цены лота.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Мозырская торговая компания «Полесье») р/с № 3012203350014 в отделении ОАО «Белагропромбанк» г. Мозырь, МФО 151501945, УНП 400082468, ОКПО 01568553 **по 28 февраля 2013 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель **по 28 февраля 2013 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продается одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.11.2012 г.

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 59 73, 74 17 34 и на сайте gomeloblreklama.by

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

НАСЕЛЬНІЦТВА МІНСКА ПЕРАСЯГНУЛА 1,9 МЛН. ЧАЛАВЕК

Колькасць насельніцтва ў Мінску перасягнула 1,9 млн. чалавек і ў параўнанні з пачаткам 2012 года павялічылася на 15,7 тыс. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў Галоўным статыстычным упраўленні горада.

За кошт натуральнага прыросту сталічных жыхароў стала на 4,9 тыс. больш, міграцыйнага -- на 10,8 тыс. больш. Самымі шматлікімі раёнамі сталі Фрунзенскі і Маскоўскі, у якіх пражывала 427,3 тыс. і 276,3 тыс. чалавек адпаведна, самыя нешматлікія -- Партызанскі і Цэнтральны раёны (99,2 тыс. і 108,5 тыс. чалавек адпаведна).

За 2012 год у сталіцы нарадзілася 22 тыс. 362 дзіцяці, што на 1 тыс. 172 больш, чым у 2011 годзе. Рост колькасці народжаных назіраўся ва ўсіх раёнах горада. Па колькасці нованароджаных лідзіруюць Фрунзенскі (5 тыс. 535 дзяцей), Маскоўскі (3 тыс. 414) і Заводскі (2 тыс. 636) раёны. Найменш дзяцей зарэгістравана ў Партызанскім (1 тыс. 194 дзіцяці) і Цэнтральным (1 тыс. 299 дзяцей) раёнах.

ПАЗАДАРОЖНІК ПРАВАЛІЎСЯ ПАД ЛЁД

У Стаўбцоўскім раёне ў турыстычна-аздараўленчым комплексе на беразе Нёмана чацвёра адпачывальнікаў вырашылі пакатацца на квадрацыклах. Уладальнік пазадарожніка з расійскімі нумарамі далучыўся да іх на ўласнай машыне. Ён паспеў праехаць літаральна 15 метраў па рацэ, як транспартны сродак часткова праваліўся пад лёд...

Кіроўца самастойна пакінуў аўтамабіль, які тануў. На шчасце, мужчына не пацярпеў. А вось вызваліць цяжкую машыну з лядовага палону ў кампаніі не атрымалася, і грамадзяне былі вымушаны звярнуцца да выратавальнікаў. Работнікі Стаўбцоўскага раённага аддзела МНС якраз вярталіся з праверкі жылога сектара і праязджалі каля вёскі Мікалаеўшчына. Аўтамабіль пры дапамозе эвакуатара выцягнулі на бераг.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ З «ЧЭРВЕНЬСКАГА» МОЖНА ПАВІНШАВАЦЬ З НАВАСЕЛЛЕМ?

Гэты сталічны рынак спыняе працу 1 лютага, прадпрымальнікі пераязджаюць на новае месца. Пачатак апошняга месяца зімы — не першы прызначаны тэрмін закрыцця згаданага гандлёвага аб'екта.

— Рашэнне аб закрыцці Чэрвеньскага рынка прынята афіцыйна і канчаткова. Ёсць дакументы, у якіх акрэслены мерапрыемствы па падрыхтоўцы і пераездзе на новае месца, — патлумачыў карэспандэнту «Звязды» **начальнік упраўлення прадпрымальніцтва камітэта эканомікі Мінгарвыканкама Іван ЯФІМАЎ.** — Хачу адзначыць, што ўся работа праводзіцца з улікам меркавання прадпрымальнікаў. Падчас будаўніцтва новага рынка неаднойчы звярталася ўвага, што для рэалізацыі праекта важна акрэсліць дакладны тэрмін. Справа ва ўзгадненні дзеянняў і некаторых недапрацоўках. Гэта і прывяло да такой колькасці пераносаў.

Да канца студзеня павінны скончыцца будаўнічыя работы на новай пляцоўцы на вуліцы Маякоўскага, куды будзе перанесены гандаль. Прадпрымальнікі, што працуюць у «Чэрвеньскім пасажы», які месціцца побач з рынкам, застануцца на месцы да 1 сакавіка. Па словах Івана Яфімава, гэта звязана з тым, што пляцоўку, куды плануюць перавезці гэты аб'ект, пакуль не вызваліў прыватны ўладальнік.

Варта нагадаць, што дата закрыцця Чэрвеньскага рынка прызначалася не адзін раз. Спачатку ў якасці гэтага дня разглядалася 1 чэрвеня 2012 года, пазней яна змясцілася на жнівень. Пасля ўлады Мінска выказвалі надзею, што прадпрымальнікі пераедуць на новае месца да 1 студзеня гэтага года. За ўвесь час, пакуль ішло абмеркаванне пераезду і падрыхтоўка да яго, з Чэрвеньскага на іншыя рынкі сталіцы перайшло працаваць каля 60 індывідуальных прадпрымальнікаў. Замест былых гандлёвых радоў кампанія з Ірана збіраецца пабудаваць тут шматфункцыянальны грамадска-дзелавы і гандлёва-забаўляльны комплекс.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

НА АСОБНЫХ ТЭРЫТОРЫЯХ ЗАБАРАНІЛІ ВЕСНАВОЕ ПАЛЯВАННЕ

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ўстанавіла забарону на веснавое паляванне на гусь белалобую, гусь-гуменніка, гусь шэрую, канадскую казарку, крыжанку да 1 студзеня 2015 года ва ўгоддзях 19 паляўнічых гаспадарак краіны.

Забарона будзе дзейнічаць на асобных тэрыторыях пяці абласцей. На Брэстчыне гэта рэспубліканскі біялагічны заказнік «Спораўскі», тэрыторыі рыбгасаў «Страдач» і «Днепра-Бугскі», сажалкі таварыства «Дзік», затопленыя выпрацаваныя тарфяныя радовішчы «Шышава» і «Кустовічы», участак меліярацыйнай сістэмы «Ракітно», участкі рэк Прыпяць, Піна і Ясельда з прылеглымі да іх тэрыторыямі. У Віцебскай вобласці нельга будзе паляваць на азёрах Снуды, Дрысвяты, Поцех, Нядрова, Плючы, Абстэрна, Асвейскае, торфараспрацоўках «Асінторфскія» і прылеглай да іх тэрыторыі, балоце «Ельня» і прылеглай да яе тэрыторыі.

У Гомельскай вобласці забарона распаўсюджваецца на ўчастак ракі Прыпяць каля Турава і прылеглай да яго тэрыторыі. У Мінскай вобласці гэта ўчасткі рэк Бярэзіна і Гайна з прылеглымі да іх тэрыторыямі. На Магілёўшчыне нельга будзе паляваць на вадаплаўную птушку на ўчастку Дняпра і прылеглых да яго тэрыторыях у Быхаўскім раёне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЫЗВАЛЕНЫЯ Ў ДАГЕСТАНЕ БЕЛАРУСЫ — ДОМА

Чацвёра беларусаў некалькі дзён таму былі выратаваны з рабства ў Дагестане падчас рэйду актывістаў моладзевага руху «Альтэрнатыва» і прадстаўнікоў МУС Рэспублікі Дагестан.

Грошай, а таксама дакументаў і магчымасці вярнуцца дадому людзі былі пазбаўлены на працягу сямі месяцаў працы на цагельным заводзе. У сяло Краснаармейск паблізу Махачкалы нашы суайчыннікі трапілі, шукаючы заробак у Расіі. Замест абяцанай працы на алімпійскіх аб'ектах у Сочы мужчыны атрымалі 12-гадзінны працоўны дзень, а таксама невыносныя ўмовы пражывання і дрэнную харчаванне. Акрамя грамадзян Беларусі, з рабства ўдалося вызваліць яшчэ пяць чалавек. Пацярпелых прывезлі ў Махачкалу, пасля чаго на аўтобусе даставілі ў Маскву. Пры падтрымцы МУС Дагестана для грамадзян Беларусі, якія былі выратаваны ў Краснаармейску, удалося забяспечыць выплату заработнай платы. Зараз вызваленыя ўжо павінны быць на тэрыторыі нашай краіны.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

ДОБРАЯ БАЛЬНІЦА — У ДОБРЫХ РУКАХ

З дня адкрыцця Шаркаўшчынскай бальніцы, яшчэ раз прыгадаем, мінула 80 дзён. Але за гэты час прайшлі кваліфікаваны курс лячэння ўжо больш за тысячу жыхароў райцэнтра і раёна. А яшчэ за гэты тэрмін нарадзілася 19 немаўлят, што мясцовыя статысты паспелі назваць усплёскам нараджальнасці. Бо ў сярэднім за год на Шаркаўшчыне з'яўлялася каля 70 немаўлят. Магчыма, гэта толькі супадзенне. Як і той незабыўны і шчаслівы выпадак, калі менавіта ў дзень урачыстага адкрыцця бальніцы на свет з'явіўся новы шаркаўшчынец.

Звычайна ўсе «экскурсіі» па медыцынскай установе тут пачынаюцца з дзіцячага (педыятрычнага) аддзялення. Відаць, таму, што на другім паверсе левага крыла светлыя палаты, гульнявы пакой для маленькіх дзетак — з вялікай колькасцю цацак, шыкоўнай мэбляй і вялікім плазменным тэлевізарам. Не выключаецца і акалічнасць, што ў гэтым аддзяленні працуе сапраўдны «кветнік» маладых урачоў і медсясцёр, якімі кіруе вопытны і з вялікім стажам спецыяліст педыятрыі — Святлана Магалінская.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

У бальніцы пяць аддзяленняў, а медперсаналу — амаль 300 чалавек. Сярод іх ёсць некалькі дынастый. Напрыклад, Генрых Качан, адзін са старэйшых медыкаў, і яго сын Павел. Генрых Мікалаевіч — урач-нарколаг і ўрач ультрагукавога выпраменьвання. Сын Павел — хірург, у гэтай установе працуе першы год. Як малады спецыяліст, ён задаволены, што ёсць магчымасць працаваць на сучасным абсталяванні ва ўмовах, якія нічым не саступаюць узроўню сталічных бальніц.

— Нашы спецыялісты не ўтойваюць свайго пазітыўнага настрою на працу, бо бачаць узровень, бачаць, што бальніца забяспечана па апошнім слове тэхнікі», — кажа галоўны ўрач установы Станіслаў Стома. — Зразумела, мы абавязаны мець і лепшыя паказчыкі, і наш калектыў на іх настроены.

Станіслаў Тадэвушавіч падкрэслівае, што і старэйшыя, і маладыя спецыялісты імкнуцца атрымаць вышэйшую ўрачэбную і сястрынскую катэгорыю і ўвесь час праходзяць курсы павышэння кваліфікацыі. Бо без ведання сучасных тэхналогій і тэндэнцый у медыцыне сёння працаваць нельга.

Сучаснае абсталяванне бальніцы-навасёла сапраўды ўражвае. Вось ужо дзе не пашкадавала дзяржава грошай! Ёсць тут і свой «японскі зонд» — апарат відэафібраскоп. І біяхімічны аналізатар для даследвання крыві, імуна-ферментны, аналізатар глюкозы, два апараты ўльтрагукавога выпраменьвання. А што ўжо казаць пра абсталяванне аперацыйных пакояў, рэанімацыйнага блока, таго ж радзільнага аддзялення! Кабінеты ўсіх спецыялістаў забяспечаны камп'ютарамі і неабходным дыягнастычным абсталяваннем. Нават у псіхатэрапеўтычным аддзяленні, дзе праходзяць курс лячэння ад алкагалізму, нарказалежнасці і тытуню, кабінет забяспечаны апаратам тэстэрапіі. Асаблівы гонар «маладой» бальніцы — водалячэбніца.

— Сярэдні ўзрост сястрынскага персаналу — 38-40 гадоў, — кажа галоўная медсястра Валянціна Хаданёнак. — Для прыцягнення і захавання нашых спецыялістаў, мы стварылі добрыя ўмовы не толькі для працы, але і для адпачынку. Ёсць вялікая сталовая, наладжваем комплексныя абеды. Як кажуць, медыкі таксама людзі, патрэбен клопат і пра іх.

На фотаздымках: *галоўная шаркаўшчынская медустанова нечым нагадвае птушку з распрасцёртымі крыламі; урач-хірург Аксана СЕЛІВАНАВА і медсястра вышэйшай катэгорыі Вольга БАХІР — спецыялісты работы з апаратурай у эндаскапічным кабінеце; сямейная дынастыя медыкаў — Генрых і Павел СТОМЫ спяшаюцца на чарговую ранішнюю планёрку.*

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара

Даты. Падзеі. Людзі

1921 год — нарадзіўся (вёска Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці) Іван Шамякін, народны пісьменнік Беларусі (1972), акадэмік НАН Беларусі (1994), Герой Сацыялістычнай Працы (1981). У 1952-1953 гадах — галоўны рэдактар альманаха «Савецкая Айчына». У 1976-1980 гадах — першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. У 1980-1992-м — галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя» імя П. Броўкі. Аўтар вядомых апавяданняў, аповесцяў, раманаў: «Сэрца на далоні», «Трывожнае шчасце», «Атланты і карыятыды», «Слаўся, Марыя» і іншых. Яго творы перакладзены на шмат моў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951), Літаратурнай прэміі імя Я. Коласа (1959), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1968, 1982), прэміі Саюзнай дзяржавы (2002). Памёр у 2004 годзе.

1882 год — нарадзіўся Франклін Дэлано Рузвельт — 32-і прэзідэнт Злучаных Штатаў Амерыкі, адзін з самых вядомых палітыкаў XX стагоддзя. Ён кіраваў краінай у перыяд самага цяжкага эканамічнага крызісу з пачатку прамысловай рэвалюцыі і самай буйной вайны сусветнай гісторыі. «Мы выйграем вайну, і мы выйграем мір, — заяўляў ён. — Каб цывілізацыя ацалела, мы павінны культываваць навуку чалавечых узаемаадносін, здольнасць усіх народаў, самых розных, жыць разам у міры на адной зямлі».

1948 год — нарадзіўся (горад Гродна) Аляксандр Уладзіміравіч Фралоў, беларускі вучоны ў галіне медыцынскай інфарматыкі, кардыялогіі, доктар біялагічных навук (1996). Аўтар навуковых прац па медыцынскай інфарматыцы, кардыялогіі, апрацоўцы сігналаў. Арганізаваў серыйны выпуск лічбавых дыягнастычных прыбораў і праграмнага забеспячэння. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996).

Было сказана

Васіль БЫКАЎ (1924-2003), народны пісьменнік Беларусі:

«Вопыт няўдач ды пакут нічога не значыць, бо кожнае пакаленне ўсё пачынае спачатку».

Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:
- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1172557, 0891148, 0891169, 0903192, 0840835, 0935035-0935036, 0935038, 1076605, 1107440, 1107475-1107476, 1119474, 1145762, 1153075, 1101960, 0928424-0928425, 1054928, 0817798, 0817810, 1101935;
- квитанции 1 СУ серия КС №№ 3474312, 3840830, 0280727, 0910460. УНП 100782388.

■ На слыху

СПЯВАК ДЗМІТРЫЙ КАЛДУН СТАЎ ТАТАМ

Артыст, якога і раней ніхто не мог абвінаваціць у празмерным нагнятанні ўвагі да сваёй персоны, пабраўшыся год таму шлюбам з Вікторыяй Хаміцкай (яны сустракаліся яшчэ ў школе), стаў узорным сем'янінам. Таму навіна аб нараджэнні ў пары першынца ў прэсу нават да самых адданых фанатаў дайшла са спазненнем. Ды і тое пасля даволі празрыстых намёкаў артыста ў асабістым блогу — «я — ойча», «хто тут ойча, як не я» і «цяпер я — папа Мінскі».

Фота vk.com.

Яшчэ амаль тыдзень доўжыліся спробы ўгадаць імя немаўляці. Шчасліваму тату прапаноўвалі самыя розныя варыянты: ад Аляксея да Яраслава і ад Мефодзія да Акакія («літару М забыліся прыпісаць», — аджартаваўся спявак).

Калі ж адкінуць жарты, то 10 дзён таму ў Вікторыі і Дзмітрыя нарадзіўся сын, якога назвалі Янам. «Янка Купала, Янка Маўр, Янка ...Лдун», — жартуе спявак у сваім Twitter, што прыхільнікі з задавальненнем расцягваюць на цытаты.

Маладая мама з сынам ужо дома, і адчуваюць сябе добра. Больш ніякімі падрабязнасцямі такой радаснай і важнай асабістай падзеі спявак з пабочнымі не дзеліцца — і правільна робіць. «Звязда», са свайго боку, далучаецца да шматлікіх віншаванняў і зычыць сям'і росту шчасця і дабрабыту, маме з дзіцем моцнага здароўя, а тату ў дадатак да ўласцівага яму аптымізму — вялікага запасу цярпення.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ с № 0196325 по № 0196327 считать недействительными. УНП 101883943

Утерянный бланк строгой отчетности «Страховой полис добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу Inter Partner ASSISTANSE» формы 2РНП серии БЛБ в количестве 1 штуки № 86680 в Филиале Белгосстраха по Минской области считать недействительным. УНН 600013344

■ Паслугі і цэны

АНТЫКРЫЗІСНЫ ПАДЫХОД

Попыт і прапанова

Нягледзячы на тое, што цэнтральны Дом быту ў Магілёве стаіць зачынены, з бытавымі паслугамі ў абласным цэнтры (прынамсі, з рамонтам адзення) праблем няма. Гісторыя пра няўдалы продаж будынка Дома быту, які зараз вяртаецца ва ўласнасць горада, вядомая магілёўцам, але ўлады стварылі цэнтры бытавога абслугоўвання на мікрараёнах. Там працуюць і швейныя майстэрні, якія бяруцца за пашыў новага адзення і рамонт старога.

— Гэтую паслугу аказваюць і дзяржаўныя швейныя атэлье, — расказвае Вольга Януковіч. — Напрыклад, у самым цэнтры ёсць швейна-трыкатажнае атэлье «Мара», дзе адрамантуюць любое адзенне. Гэтаксама і ў іншых атэлье.

У гарвыканкаме каментуюць, што ў Магілёве адкрываюцца прыватныя швейныя майстэрні: літаральна днямі камісія па арэндзе дала «дабро» прыватнай швейнай справе на размяшчэнне ў адным з мікрараёнаў.

Калі ў абласным цэнтры адзенне рамантуюць найбольш прыватнікі, то ў сельскіх раёнах нагрузку на сябе бяруць прадпрыемствы сістэмы «Бытпаслугі». У аграгарадках, калі няма мясцовага майстра, прымаюць заказы і вязуць іх у раённы цэнтр.

— Увогуле ў нас дастаткова швейных майстэрняў і атэлье, — лічыць Вольга Януковіч. — Думаецца, што ўсё гэта рэгулюе рынак: калі ёсць попыт на паслугу — будзе і прапанова.

Па-за крызісам і часам

Гавораць, што рамонт абутку стаў надзвычай запатрабаваным пасля крызісу. Людзі, якія не мелі свабодных грошай на набыццё новых пар, даставалі з шафаў старыя і абнаўлялі іх. Калі даводзіцца моцна эканоміць, то ў справу пойдуць і іншыя старыя рэчы.

Аднак Вольга Януковіч не лічыць, што папулярнасць рамонту адзення звязана з крызісам. Таму што гэтая паслуга якраз датычыцца не толькі старых рэчаў, але і новых, толькі што набытых.

— Гэта ўсё ж пастаянная паслуга, якая не залежыць ад спаду і пад'ёму ў эканоміцы, — гаворыць спецыяліст. — Таму што любы чалавек мае патрэбу ў падгонцы адзення па росце. І не было такога часу, што людзі зусім не прыходзілі з такімі праблемамі ў атэлье.

Найбольш распаўсюджаная просьба — падкараціць штаны. Каштуе гэта, у залежнасці ад складанасці, прыблізна ад 20 да 40 тысяч рублёў. Цэны прымальныя. А многія кажуць, што гэта сімвалічныя грошы, у параўнанні са звычайным паходам у харчовую краму.

Яшчэ адна распаўсюджаная бяда сучаснага спажыўца — паламаныя «маланкі» як на адзенні, так і на сумках. З такой праблемай цяпер лёгка спраўляюцца нават у шапіку ў падземным пераходзе. За 14-15 тысяч рублёў проста на месцы мяняецца бегунок на «маланцы», і патрэбная рэч атрымлівае другое жыццё.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Свая рамонтная справа

У тэлефонным даведніку знайшоўся тэлефон індывідуальнай прадпрымальніцы Ірыны Дорашавай, якая рамантуе адзенне і сумкі.

Гэта маладая жанчына мае зусім іншую адукацыю — сакратара і бібліятэкара, але потым, як кажа Ірына, «прырода перамагла». Яна з 12 гадоў шые і атрымлівае ад гэтай працы задавальненне. Таму цяпер яна прадпрымальніца, арандуе куток у цэнтры горада, і за некалькі гадоў у яе склалася сваё кола кліентаў, якія задаволены якасцю і цэнамі на рамонт.

— Да мяне прыходзяць людзі з рознымі даходамі, — расказала Ірына. — Трэба ж зважаць на тое, што і пераробка адзення, калі там вялікая і складаная праца, каштуе нятанна. Але найбольш папулярныя работы не б'юць па кішэні: падкараціць — 28-40 тысяч рублёў, падлатаць джынсы (вельмі запатрабавана ў маладых і старых) каштуе ад 25 да 50 тысяч рублёў.

«Цяпер час пераробак!» — так лічыць магілёўская прыватная швачка Вольга. І не толькі таму, што людзям выпадае эканоміць, а таму, што няма ніякай гарантыі, што падобная новая рэч будзе лепшай.

— Якасць новай швейнай прадукцыі часта сумнеўная, — кажа швачка. — Верагодна, што крызіс і канкурэнтная барацьба на рынках вымагае і прадпрыемствы эканоміць на сыравіне. Але так ці іначай, часам выгадней заплаціць грошы за рэстаўрацыю і спакойна насіць тое, што ёсць.

Цэны ў прыватных швачак, якія працуюць дома, прыкладна такія ж: у сярэднім ад 10 да 100 тысяч рублёў.

Абнавіце веснавы сілуэт

Швачкі гавораць, што цяпер для рамонту адзення — практычна «мёртвы» сезон. Падгонкі новага адзення былі актуальныя да навагодніх свят, а новыя пакупкі, як і выцягванне «вінтажу» з куфраў і шафаў, адбудзецца бліжэй да цёплых дзён.

З веснавым абнаўленнем жыцця будзе ажыўленне і ў швейных майстэрнях. Пакуль жа самыя папулярныя работы ў атэлье Магілёўскай фабрыкі індпашыву і рамонту адзення звязаны з цёплым футрам (і асабліва галаўнымі ўборамі), што з'яўляецца вынікам зімовых халадоў.

У гэтага прадпрыемства тры атэлье ў Магілёве. Калісьці ў абласным цэнтры было папулярнае атэлье «Абнавіце», аднак у найноўшы час дэфіцытнае памяшканне ў цэнтры горада было прададзена прыватніку і рамантуецца дзеля іншых мэт. Тым не менш літаральна праз некалькі кварталаў паспяхова працуе атэлье «Абнавіце сілуэт», дзе таксама рамантуюць адзенне.

— Кліенты звяртаюцца, каб перашыць, і ў наш час гэта вельмі папулярны кірунак, — пацвярджае дырэктар фабрыкі індпашыву і рамонту адзення Анатоль Куляшоў. — Цэны мы трымаем прымальныя: па-першае, канкурэнцыя з прадпрымальнікамі. Па-другое — калі «задзіраць» кошты, людзі проста не пойдуць. Хаця праўду кажуць, што «з іголкі хлеб тонкі», але зарабіць на рамонце адзення ўдаецца. І адначасова зрабіць людзям добрую справу.

Ілона ІВАНОВА.

АЎЧЫНКА ВЫРАБУ НЕ ВАРТА

Зараз адрамантаваць адзенне ці абутак у сталіцы не вельмі складана — было б жаданне. Але тут жа паўстае іншае пытанне — а ў якую суму абыдзецца рамонт? Самая непрыемная рэч, якая можа здарыцца з «экіпіроўкай» у марознае надвор'е — гэта зламаная «маланка». У расшпіленым паліто ці боце доўга ўзімку не паходзіш. Таму карэспандэнт «Звязды» выправіўся ў рэйд, каб даведацца пра кошты і тэрміны такога рамонту.

Таццяна ЕРМАЧКОВА, начальнік аддзела арганізацыі і развіцця сферы паслуг упраўлення бытавога і гасцінічнага абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама, лічыць, што на недахват майстэрняў у сталіцы скардзіцца не выпадае:

— Другое жыццё сапсаванаму абутку зараз можна падарыць у 348 майстэрнях сталіцы. Пунктаў, дзе можна адрамантаваць адзенне, яшчэ больш — 450. Амаль усе яны знаходзяцца ў прыватнай уласнасці. Штогод іх колькасць павялічваецца. Так, летась у сталіцы з'явілася 42 новыя пункты па рамонце адзення і 25 месцаў, дзе можна паправіць абутак. А гэтыя лічбы сведчаць пра тое, што паслуга запатрабавана ў грамадстве.

У абутковай майстэрні ЗАТ «Яліна», што знаходзіцца ў Доме быту Савецкага раёна, дакладную суму, якую давядзецца выкласці за замену «маланкі», назвалі адразу па прэйскуранце — 36 тысяч 860 рублёў. Паставяць яе прыкладна за дзень. Калі ж столькі чакаць не выпадае, то ў майстэрні, якая знаходзіцца ля плошчы Якуба Коласа, можна абутак паправіць тэрмінова, за некалькі гадзін. Але ў такім выпадку давядзецца дадаткова даплаціць 20% ад кошту рамонту. Можна прынесці і ўласную «маланку», і тады кашалёк схуднее толькі на 30 тысяч рублёў.

Зрэшты, гэтая сума не вельмі адрозніваецца ад іншых цэннікаў, агучаных у трох іншых майстэрнях. Там адрамантаваць «маланку» ў боце прапануюць за 35-37 тысяч. Такім чынам, істотна зэканоміць тут не ўдасца. І чакаць таксама давядзецца суткі.

А вось кошты па замене «маланкі» ў паліто крыху адрозніваюцца. Тут ужо можна зберагчы невялічкую суму ў 5-10 тысяч рублёў.

— Даволі часта кліенты звяртаюцца з просьбай памяняць бегунок. Гэта зрабіць куды танней і хутчэй, чым прышыць новую «маланку» — праца будзе каштаваць 12-15 тысяч рублёў. Аднак на бегунок гарантыя не даецца. У той жа час замяніць «маланку» цалкам абыдзецца мінімум у 80 тысяч — канчатковы рахунак залежыць ад складанасці рамонту. На якасць прышывання «маланкі» даецца непрацяглы гарантыйны тэрмін. Але ў любым выпадку стараемся ісці насустрач кліенту, калі ён прад'яўляе абгрунтаваныя прэтэнзіі, — паведамілі ў прыватным прадпрыемстве «Марылес».

Для параўнання, у майстэрні па рамонце адзення «Марыяна», якая працуе ў Доме быту Савецкага раёна, замена «маланкі» пацягне ўжо на 90-100 тысяч рублёў.

Дзве іншыя невялічкія майстэрні прапанавалі свае паслугі за 85-90 тысяч. Дзе-нідзе трэба прынесці сваю «маланку».

Такім чынам, адчувальна зэканоміць пры замене «маланкі» не атрымаецца. Напэўна, чым кідацца па горадзе ў пошуках капеечнай выгады, лепш аднесці сапсаваную рэч у майстэрню з добрай рэпутацыяй.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НА КОМПЛЕКСНЫМ ПРЫЁМНЫМ ПУНКЦЕ, У РАМЕСНІКА, НА ПОШЦЕ

можна замовіць паслугі па рамонце адзення

Гарадзец — даволі вялікі населены пункт Кобрынскага раёна. Як і любы аграгарадок, ён мае ўсе патрэбныя аб'екты сацыяльнай інфраструктуры. Ёсць тут і філіял швейнага прадпрыемства. Але бытавыя паслугі насельніцтву аказвае раённы КБА праз свой комплексны прыёмны пункт. Прыёмшчыцай там працуе Зінаіда Лунёва. Па спецыяльнасці Зінаіда Фёдараўна — швачка. Таму нешта пашыць, перашыць, адрамантаваць яна можа на месцы. Вяскоўцы нясуць ёй замяніць «маланкі» ў курткі і паліто, укараціць ці падагнаць па фігуры нейкую абноўку, а таксама перашыць старое. Яна бярэцца пашыць фіранкі і шторы, кухонныя ручнікі і сурвэткі, выконвае іншыя заказы.

Старшыня Гарадзецкага сельсавета Марыя Здановіч сказала, што яна з задавальненнем замаўляе паслугі ў Зінаіды Фёдараўны, бо майстрыха робіць якасна і акуратна, у тэрмін. А некалькі гадоў таму з наступленнем пенсійнага ўзросту Зінаіда Лунёва пакінула работу. На яе месца ўзялі маладую прыёмшчыцу. Дык ледзьве дачакаліся канца года, на які быў заключаны кантракт з новай супрацоўніцай. І ледзь не ўсёй грамадой прасілі вярнуцца на працу былую швачку.

У Зінаіды Фёдараўны заказаў у цэлым нямнога, зарплата зусім невялікая. Раённы КБА па просьбе сельвыканкама дае ёй дадатковую работу: пашыць пасцельную бялізну, рабочае адзенне, прыцягвае да выязнога гандлю, — усё з тым, каб даць лепей зарабіць і заахвоціць чалавека застацца на працы.

У вёсцы Мінянка гэтага ж раёна пункта бытавога абслугоўвання няма. Падчас нядаўняй камандзіроўкі спытала ў работнікаў школьнай сталоўкі, куды яны звяртаюцца, калі ўзнікае патрэба адрамантаваць адзенне. Адказ крыху здзівіў: «Нясём на пошту».

— Нічога дзіўнага, — сказала намеснік начальніка Кобрынскага вузла паштовай сувязі Зоя Каляда. — Ужо добрую пяцігодку мы аказваем такія паслугі насельніцтву там, дзе няма прадпрыемства бытавога абслугоўвання. Супрацоўнік вясковай пошты бярэ заказы на рамонт адзення, абутку, афармляе патрэбныя дакументы. Паштовай машынай рэчы дастаўляюцца ў раённы КБА, дзе праводзіцца рамонт, потым зноў пошта забірае гатовы тавар і дастаўляе па адрасах кліентаў. Дагаворы заключаны на раённым узроўні, сістэма адладжаная, а людзям вельмі зручна: не трэба з элементарнай «маланкай» для курткі выбірацца ў райцэнтр.

Да швачкі Алены ГАЛАЎЧУК едуць нават з райцэнтра і суседніх вёсак.

У пасёлку Ленінскі Жабінкаўскага раёна з насельніцтвам 2,5 тысячы чалавек ёсць КБА, але там працуюць і тры прадпрымальнікі па аказанні бытавых паслуг насельніцтву. Спачатку бытавікі пабойваліся канкурэнцыі, але мясцовая ўлада падтрымала ініцыятыўных людзей. У выніку работы хапае ўсім, канкурэнцыя пайшла на карысць якасці, кліент задаволены і сам выбірае, да каго звярнуцца з заказам.

Калі трэба адрамантаваць адзенне, жыхары Ленінскага і навакольных вёсак ідуць да швачкі Алены Галаўчук. Да Алены Сцяпанаўны нясуць сукенкі, касцюмы, паліто. Але на гэтых паслугах у сельскім населеным пункце на жыццё не заробіш. Таму яна займаецца справай, якая заўсёды цікавіла — «апранае» вокны. У каталогу Алены Галаўчук змяшчаюцца дзясяткі ўзораў фіранак, штор, ламбрыкенаў для розных відаў пакояў. Кожнаму наведніку яна прапануе эксклюзіўны варыянт у залежнасці ад велічыні акна і пакоя, ад колеру мэблі і шпалер. Людзі даўно ацанілі яе майстэрства, таму да Алены Галаўчук і ездуць адусюль.

У мінулыя гады, калі навасёлаў было больш, у яе заказаў хапала. Апошнім часам, будаўніцтва трохі запаволілася, і навасельляў стала менш, ды і грошы людзі лічаць больш уважліва. Многія гаспадыні самі ўзяліся шыць свае шторы, як умеюць: хоць няякасна, але ж бясплатна.

А майстар тым часам таксама прызвычаілася да новых эканамічных умоў: яна змяніла свой статус з прадпрымальніка на рамесніка. Застаўся адзін фіксаваны падатак, які яна рэгулярна выплачвае, ды арэндныя выдаткі. Тут і сельвыканкам пайшоў ёй насустрач: пакойчык памянялі на меншы, каб лягчэй плаціць было за арандаваныя метры.

За гады работы ў швачкі склалася сваё кола кліентаў. Хто хоць аднойчы ў яе нешта шыў, рамантаваў, той, як правіла, прыходзіць зноў. «Ніколі не рабіла абы-як, — кажа швачка. — Не магу сабе дазволіць гэтага. Мы ж усе побач жывём, штодня сустракаемся. Калі чалавек прынясе мне памяняць «маланку» ў куртцы, а я заўважу нейкі дэфект на шве ці дзірку, абавязкова папраўлю, хоць мне замаўлялі толькі адну паслугу».

Побач працуе індывідуальны прадпрымальнік па рамонце абутку, яго таксама хваляць у аграгарадку.

Святлана ЯСКЕВІЧ. Фота аўтара.

Ад гісторыі да сучаснасці

Знаёмства з РУП «Мінск Крышталь» пачынаем з музея, які знаходзіцца на тэрыторыі завода. Па шматлікіх узнагародах, якіх у выставачнай зале сабрана больш як 700, смела можна прасачыць гісторыю «гіганта», што прыпала на тры стагоддзі. Кропка адліку — 1893 год, калі браты Ракаўшчыкі заснавалі дрожджа-вінакурны завод у Мінску на Ніжняляхаўскай (цяпер Кастрычніцкай) вуліцы. Да слова, карпусы, якія захаваліся з тых часоў, і дагэтуль выкарыстоўваюцца ў вытворчых мэтах. Пачыналася ж усё з 20 работнікаў і паравой машыны магутнасцю ўсяго толькі 5 конскіх сіл. Паступова вытворчасць набірала абароты: праз 20 гадоў завод, дзе працавала ўжо 50 чалавек, праславіўся як самае дарагое па тэхнічнай аснашчанасці прамысловае прадпрыемства горада Мінска і найбуйнейшае ў сваёй галіне ў Беларусі. Прадукцыя з фірменным знакам братоў Ракаўшчыкоў карысталася попытам у расіян, часта звярталіся па яе і заможныя князі Радзівілы. Па вартасці ацэньвалася заводская прадукцыя і на шматлікіх выставах. Аб гэтым сведчаць залатыя медалі, атрыманыя на выставе ў Парыжы ў 1905 годзе і на растоўскай выставе пастаўшчыкоў імператарскага двара 1906 года, галоўная прэмія на рымскай выставе ў 1911 годзе і шэраг іншых высокіх узнагарод.

За 120 гадоў (а сваю дзейнасць завод не спыняў нават у гады вайны) адбылося шмат пераўтварэнняў. І толькі ў 2002 годзе Мінскі вінна-гарэлачны завод «Крышталь» быў пераўтвораны ў вытворча-гандлёвае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мінск Крышталь».

Сёння РУП «Мінск Крышталь» — шматпрофільнае прадпрыемства з перадавой тэхналогіяй і замкнёным цыклам вытворчасці, магутным вытворча-тэхналагічным патэнцыялам, здольнае гнутка рэагаваць на патрэбы рынку. З кожным годам яно толькі набірае вышыню і пашырае свае пазіцыі ў свеце.

Генеральны дырэктар РУП «МІНСК КРЫШТАЛЬ» Станіслаў ІОДЗІС:

«БЕРАЖОМ ТРАДЫЦЫІ,

Сёлета адно з найбольш паспяховых прадпрыемстваў у Беларусі

адзначае 120-гадовы юбілей.

Праходзяць дзесяцігоддзі, абнаўляецца асартымент, удасканальваецца стыль работы, але нязменным застаецца адно — стабільна «крыштальная» якасць выпускаемай прадукцыі.

У фірменных крамах РУП «Мінск Крышталь» ветлівыя прадаўцы заўсёды гатовы дапамагчы зрабіць выбар.

Пра сувенірную прадукцыю, імпартазамяшчэнне і планы на будучыню

Генеральны дырэктар РУП «Мінск Крышталь» Станіслаў ІОДЗІС скончыў Украінскую юрыдычную акадэмію, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, інстытут кіруючых работнікаў Мінгандлю. Станіслаў Антонавіч мае багаты вопыт кіравання. З канца 2011 года ён знаходзіцца каля штурвала дзяржпрадпрыемства «Мінск Крышталь».

— Станіслаў Антонавіч, у актыве РУП «Мінск Крышталь» больш за 700 узнагарод. Якое яны маюць значэнне і ці можаце вылучыць самую галоўную з іх?

— Толькі ў 2012 годзе прадукцыя прадпрыемства была 29 разоў адзначана на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і выставах. Кожная з ўзнагарод, безумоўна, каштоўная па-свойму, павышае прэстыж прадпрыемства і яго канкурэнтаздольнасць. За кожнай з іх стаіць праца адданага сваёй справе калектыву. Калі казаць пра галоўную ўзнагароду, то, як вядома, «Мінск Крышталь» з'яўляецца лаўрэатам Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь 2007 года за дасягненні ў вобласці якасці з уручэннем дыплома і сімвала гэтай ганаровай узнагароды. Яна дае права на працягу 5 гадоў выкарыстоўваць гэты сімвал у тым ліку і ў рэкламных мэтах. Цяпер перад калектывам стаіць задача пацвердзіць гэтае званне. Але ўзнагароды — не самамэта. Гэта пацвярджэнне высокай якасці «крышталеўскай» прадукцыі, якая, як вядома, адзначаецца не толькі медалямі і граматамі, але і нашымі незалежнымі экспертамі — пакупнікамі.

— На паліцах у крамах сёння шмат напояў «пад градусам» самых розных вытворцаў. Як удаецца вытрымліваць канкурэнцыю?

— «Мінск Крышталь» мае імя, напрацаванае дзесяцігоддзямі, і той пакупнік, які шануе нашы векавыя традыцыі, галасуе рублём менавіта за якасць, праверaную часам. Мы ж, у сваю чаргу, не стаім на месцы, пастаянна знаходзімся ў пошуку. Так, ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі плануем за 2013 год аптымізаваць асартыментны «партфель» нашай прадукцыі. Кіруемся пры гэтым, у першую чаргу, перавагамі спажыўцоў.

— Асабіста мяне ўразіў багаты выбар арыгінальнай сувенірнай прадукцыі на паліцах фірменнай крамы. Ці прымае гендырэктар удзел у распрацоўцы новых яе відаў?

— Што тычыцца сувенірнай прадукцыі, то мы ёй таксама надаём нямала ўвагі: сёння выпускаецца каля 30 найменняў. Бутэлькі «з нацыянальным каларытам», аздобленыя, у тым ліку керамікай і скурай, вельмі папулярны сярод замежных турыстаў. Работы па распрацоўцы новых відаў прадукцыі ўключаюцца ў штогадовы комплексны план забеспячэння прадпрыемства. Яны праводзяцца ў адпаведнасці з парадкам, прапісаным у стандартах прадпрыемства. Трэба адзначыць, што ў нас створана камісія па распрацоўцы новых відаў прадукцыі і ўмацаванні пазіцый прадпрыемства на рынках. Па меры неабходнасці збіраемся і прымаем або адхіляем напрацаваныя ідэі адносна ўкаранення новых відаў бутэлек і іх афармлення. Напрыклад, цяпер ідзе сур'ёзная распрацоўка сувенірнай прадукцыі да 120-годдзя завода.

— І калі юбілейную «сувенірку» можна будзе набыць?

— Думаю, што гэтую юбілейную эксклюзіўную прадукцыю вы зможаце набыць у бліжэйшы час у нашых фірменных крамах. Іх у нас пакуль што 22, у тым ліку 6 у Мінску. У снежні мінулага года свае дзверы для пакупнікоў адчыніла фірменная крама ў Лідзе.

— Ці ёсць неабходнасць нейкімі спецыяльнымі акцыямі ўтрымліваць пастаянных кліентаў або разлік робіцца толькі на іх звычку і свайго роду «патрыятызм»?

— Безумоўна, РУП «Мінск Крышталь» актыўна праводзіць прома-акцыі і дэгустацыі сваёй прадукцыі як у рознічнай сетцы, так і ў сваіх фірменных крамах. Акрамя таго, сёння асноўным рычагом прасоўвання прадукцыі на рынку з'яўляюцца акцыі на зніжэнне кошту. Таксама РУП «Мінск Крышталь» актыўна ўдзельнічае ў міжнародных выставах, дзе прадукцыю прадпрыемства, у тым ліку імпартазамяшчальную, адзначаюць спажыўцы і спецыялісты ў галіне як высакаякасную, якая не саступае аналагам на сусветным рынку. Толькі на праграме імпартазамяшчэння за мінулы год удалося сэканоміць 10 млн долараў.

— У чым заключаецца маркетынгавая стратэгія РУП «Мінск Крышталь» на 2013 год?

— Развіццё стратэгічнага аспекту маркетынгу на рынку спажывецкіх тавараў мае выключна важнае значэнне. Бо адсутнасць на прадпрыемстве дакладна распрацаванай стратэгіі, якая заснаваецца на выніках маркетынгавых даследаванняў, можа прывесці да зніжэння эфектыўнасці маркетынгавай дзейнасці і страты канкурэнтных пераваг прадпрыемства. Сутнасць маркетынгу на сучасным спажывецкім рынку — у пошуку тэце індывідуальных патрэбнасцяў над усёй вытворча-камерцыйнай дзейнасцю прадпрыемства. Таму маркетынг павінен разглядацца не толькі як адзін з элементаў кіравання, але і як глабальная функцыя, якая вызначае змест усёй дзейнасці прадпрыемства па вытворчасці і збыце прадукцыі. Галоўная мэта маркетынгавай стратэгіі РУП «Мінск Крышталь» — у падтрыманні высокіх стандартаў якасці, павелічэнні аб'ёму продажаў і прыбытку, максімальна поўным задавальненні існуючых і стварэнне магчымасцяў для задавальнення новых патрэбнасцяў спажыўцоў. Я не па чутках ведаю, як важна ўлічваць попыт, таму, як толькі прыйшоў на прадпрыемства, пачаў актыўна займацца стварэннем маркетынгавай службы.

— Якой вы бачыце будучыню прадпрыемства? Як кіраўнік чаму аддаяце прыярытэт?

— Сёння РУП «Мінск Крышталь» — лідар беларускага рынку па аб'ёмах выпуску прадукцыі. І мы па-ранейшаму будзем захоўваць свае лідзіруючыя пазіцыі. Безумоўна, працягнем і надалей расшыраць геаграфію сваіх паставак, у тым ліку і на тэрыторыі краін Мытнага саюза. Зараз РУП «Мінск Крышталь» знаходзіцца на стадыі маштабнага рэбрэндынгу. Мы мяняемся, удасканальваемся, але пры гэтым захоўваем усё самае лепшае — праверaныя тэхналогіі, натуральнасць пры вытворчасці, ну і безумоўна, векавыя традыцыі. Традыцыі — гэта святое. Мы іх падтрымліваем, аднаўляем, развіваем. Адарвацца ад каранёў «Крышталя» было б няправільна. Я лічу, што толькі на моцных каранях заўсёды будзе зелянець верхавіна. Сёлета прадпрыемству спаўняцца 120 гадоў. Гэта вельмі сур'ёзная для нас дата. Хочацца пажадаць сваім калегам усяго самага найлепшага, а самае галоўнае — здароўя. Бо людзі, якія працуюць на прадпрыемстве і выпускаюць выдатную прадукцыю, — галоўная каштоўнасць РУП «Мінск Крышталь». Упэўнены, што кожны з іх ганарыцца тым, што носіць імя «крысталяўца», і з разуменнем ставіцца да патрабаванняў, якія да яго прад'яўляюцца. Я ж, у сваю чаргу, як кіраўнік, стараюся заахвочваць іх, у тым ліку і матэрыяльна. Лічу, што ў людзей павінен быць стымул, яны павінны ведаць, што за сваю працу будуць адзначаны.

Начальнік фізкультурна-аздараўленчага комплексу Валянцін НАВАГРОДСКІ распавёў, што ў музеі РУП «Мінск Крышталь» сабрана больш як 700 шматлікіх узнагарод, па якіх смела можна прасачыць гісторыю «гіганта».

Пра сістэмны кантроль і «крыштальную» якасць

Прадукцыя, што выпускаецца на прадпрыемстве «Мінск Крышталь», займае ўстойлівае становішча на рынку. Гэтаму садзейнічае, як паведаміла **начальнік аддзела па стандартызацыі і метралогіі Наталля БЕЛАЯ,** у першую чаргу, яе «крыштальная» якасць, якая адпавядае, як нацыянальным, так і міжнародным стандартам. Для забеспячэння падтрымання стабільна высокай якасці задавальнення патрабаванняў і чаканняў спажыўцоў на РУП «Мінск Крышталь» укаранёны міжнародна прызнаныя сістэмы менеджменту.

— Не сакрэт, што партнёры, якія збіраюцца заключыць з намі кантракты на пастаўкі, перш за ўсё глядзяць на наяўнасць вызначаных сертыфікатаў якасці, — адзначае Наталля Белая. — Сёння на нашым прадпрыемстве сертыфікаваны і падтрымліваюцца ў актуальным стане сістэма менеджменту якасці (СТБ ISO 9001), сістэма кіравання якасцю і бяспекай харчовых прадуктаў на аснове аналізу рызык і крытычных кантрольных кропак (HACCP), сістэма кіравання навакольным асяроддзем (СТБ ІСО 14001) і сістэма кіравання аховай працы (СТБ 18001). Паэтапна ўкараняюцца гэтыя сістэмы і ў адасобленых структурных падраздзяленнях прадпрыемства.

Паводле слоў **начальніка лабараторыі па кантролі вытворчасці РУП «Мінск Крышталь» Святланы АСТАПЕНКІ,** за якасцю на прадпрыемстве, пачынаючы ад уваходнай сыравіны і заканчваючы выпускам гатовай прадукцыі, спецыялісты сочаць пры дапамозе выключна высокадакладнага лабараторнага абсталявання.

— Наша лабараторыя па аснашчанасці і кваліфікацыі спецыялістаў — адна з лепшых у рэспубліцы, — адзначае Святлана Астапенка. — І гэта не пустыя словы: высокая якасць, арыгінальнасць распрацаваных рэцэптур «крышталеўскай» прадукцыі і нязменная папулярнасць сярод спажыўцоў неаднаразова прызнавалася на міжнародных прафесійных дэгустацыйных конкурсах. А гэта прызнанне высокага іміджу прадпрыемства і якасці яго прадукцыі.

Лагістычны цэнтр РУП «Мінск Крышталь» — самы высокатэхналагічны лагістычны цэнтр у Беларусі.

ЛАГІСТЫЧНЫ ЦЭНТР: максімальная эфектыўнасць пры мінімальных выдатках

Адкрыццё шматфункцыянальнага гандлёва-лагістычнага цэнтра адбылося восенню мінулага года. Месціцца ён у Калядзічах, за Мінскай кальцавой аўтадарогай і, што тут утойваць, уражвае сваімі маштабамі. Ён, як аказваецца, з'яўляецца самым высокатэхналагічным лагістычным цэнтрам у Беларусі.

Сярод пераваг, якія забяспечвае новы аб'ект, **начальнік аптовага склада гандлёва-лагістычнага цэнтра Сяргей САСНОЎСКІ** назваў зніжэнне выдаткаў, а таксама скарачэнне часу руху прадукцыі ад вытворцы да спажыўца.

— Дагэтуль прадпрыемства арандавала складскія памяшканні ў іншых арганізацый, якія маюць права на захоўванне нашай прадукцыі, — распавядае Сяргей Сасноўскі. — А арэнда сёння, не сакрэт, дарагое задавальненне. Свой лагістычны цэнтр з 8-яруснай стэлажнай сістэмай на 300 тысяч дэкалітраў дазваляе эканоміць заводу вялізныя сродкі на захоўванні прадукцыі.

Цэнтр абсталяваны ўсімі неабходнымі інжынернымі камунікацыямі, а таксама чатырохпалоснай пад'язной дарогай. Яшчэ адной асаблівасцю гэтага аб'екта з'яўляецца поўная аўтаматызацыя кіравання працай транспарту, якая забяспечвае празрыстасць маршруту руху транспарту з моманту атрымання замовы на пастаўку і да перадачы грузу заказчыку. Гэта дазваляе кліентам значна скараціць транспартныя выдаткі і аптымізаваць маршрут руху транспартных сродкаў. Склад займае 7000 кв.м тэрыторыі аб'екта, што дазваляе абслужыць больш за 250 аўтамабіляў у дзень. Час загрузкі аднаго аўтамабіля складзе не больш за 30 хвілін (раней загрузка займала каля 3-4 гадзін).

— Адкрыццё лагістычнага цэнтра — важны этап у развіцці прадпрыемства, — рэзюмуе спецыяліст. — Мы ўпэўнены, што ён будзе спрыяць далейшаму ўмацаванню нашага лідарства ў алкагольнай галіне, развіццю нашых партнёрскіх адносін з пастаяннымі і новымі кліентамі і пакажа нашу нязменную прыхільнасць стратэгіі дзеяння на рынку з максімальнай эфектыўнасцю пры мінімальных выдатках.

Склад лагістычнага цэнтра займае 7000 кв.м тэрыторыі аб'екта, што дазваляе абслужыць больш за 250 аўтамабіляў у дзень.

Пра традыцыі і навацыі

Гандлёвая марка «Мінск Крышталь» — гэта спалучэнне традыцыйных класічных рэцэптур вытворчасці, закладзеных яшчэ ў XIX стагоддзі, і перадавых інавацыйных тэхналогій XXI стагоддзя. У 2012 годзе пастаўлена на вытворчасць 17 відаў новых вырабаў, распрацаваных спецыялістамі прадпрыемства.

— Мы ганарымся нашымі сучаснымі распрацоўкамі, на стварэнне якіх выдаткавана шмат сіл і часу, каб у выніку наш галоўны суддзя — спажывец — застаўся задаволены, — кажа **намеснік начальніка аддзела галоўнага тэхнолага Наталля БАРАНОЎСКАЯ.** — Прымяняем выключна натуральную сыравіну (ніякія сінтэтычныя фарбавальнікі, харчовыя дабаўкі ды араматызатары пры вытворчасці прадукцыі не дапускаюцца!).

Ствараецца новая прадукцыя на базе глыбокіх навуковых даследаванняў пры цесным супрацоўніцтве спецыялістаў прадпрыемства, лабараторыі па кантролі вытворчасці і навукова-даследчых установаў Беларусі, Расіі і Украіны.

— З гонарам можам сказаць, што сучасны «Крышталь» — гэта брэнд, — працягвае Наталля Бараноўская. — Фірменная бутэлька, адзіная лінія дызайну, запатэнтаваныя гандлёвыя знакі — усё гэта, несумненна, спрыяе запамінанню і стапрацэнтнай пазнавальнасці нашай прадукцыі.

Вытворчыя поспехі РУП «Мінск Крышталь» шмат у чым звязаны з распрацоўкай і асваеннем найноўшых тэхналогій і тэхнічным перааснашчэннем вытворчасці.

— У 2012 годзе мы правялі мадэрнізацыю асобных цэхаў, устанавілі сучаснае абсталяванне, — адзначае Наталля Бараноўская. — Тым самым палепшылі якасць выпускаемай прадукцыі і глыбіню перапрацоўкі зыходнай сыравіны, аўтаматызавалі і ўдасканалілі ўпакоўку гатовай прадукцыі, удасканалілі яе афармленне.

Сярод унікальных інавацыйных тэхналогій, якія асвоіў «Мінск Крышталь», варта адзначыць утылізацыю адходаў вытворчасці на Бярэзінскім спіртзаводзе з атрыманнем біягазу і сухой драбіны, якая ідзе на корм жывёле. Гэта, паводле слоў спецыялістаў, значна эканоміць энергарэсурсы. Якраз на гэта і нацэльвае прадпрыемства Дырэктыва Прэзідэнта №3 «Эканомія і беражлівасць — галоўныя фактары эканамічнай бяспекі дзяржавы». На 2013 год, паводле слоў Станіслава Іодзіса, запланавана, як мінімум 250 мерапрыемстваў, звязаных з эканомным расходам сыравіны, матэрыялаў, энергарэсурсаў, у тым ліку і за кошт укаранення новых тэхналогій у вытворчы працэс.

«За якасцю на прадпрыемстве сочаць пры дапамозе выключна высокадакладнага лабараторнага абсталявання», — сцвярджае начальнік лабараторыі па кантролі вытворчасці РУП «Мінск Крышталь» Святлана АСТАПЕНКА.

ПРАЗМЕРНАЕ ЎЖЫВАННЕ АЛКАГОЛЮ ШКОДЗІЦЬ ЗДАРОЎЮ

УКАРАНЯЕМ НАВАЦЫІ»

Новае збожжасховішча, разлічанае на 10 тысяч тон, дало магчымасць палепшыць якасць захоўвання збожжа

Экспартная «Ружа вятроў»

Доказам высокай якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі гандлёвай маркі «Мінск Крыштaль» з'яўляецца пастаяннае нарошчванне і расшырэнне геаграфіі экспартных паставак. Аб'ём экспарту за 2012 год у параўнанні з 2011-м вырас на 120% і склаў каля 9000 млн долараў.

Асноўная экспартная стратэгія (77%) на РУП «Мінск Крыштaль», паводле слоў **начальніка аддзела знешнеэканамічнай дзейнасці Алега ПРОХАРАВА,** арганізавана па вектарным прынцыпе: вектар «Поўнач» праз уласную тавараправодную сетку ТАА «Белхарчпрам» (Рыга) у Літву, Латвію, Эстонію (59%) і вектар «Поўдзень» — праз эксклюзіўнага дыстрыб'ютара ТАА «REYPER» у Турцыю (18%).

У 2012 годзе з'явіліся дадаткова 2 вектары ў стратэгіі экспартных паставак прадпрыемства: вектар «Усход» у супрацоўніцтве з кампаніяй «НЕМИРОФФ Водка Рус» у Расію і вектар «Захад» праз трох эксклюзіўных дыстрыб'ютараў у ЗША.

— Якасць прадукцыі прадпрыемства, праверанага часам, за апошнія пару гадоў адзначана міжнароднымі ўзнагародамі на выставах — дэгустацыях у Лондане, Каліфорніі, Чыкага, Маямі, — дадаў Алег Прохараў. — Гэта, несумненна, садзейнічае пакарэнню рынку ЗША.

У выніку з'явілася так званая «Роза Вятроў», якая дазваляе расшыраць пастаўкі па вектарных кірунках, прыцягваючы да сферы інтарэсаў прадпрыемства новыя краіны і замежныя рынкі. Цяпер прадпрыемства працуе па 51 экспартным кантракце, якія пакрываюць геаграфію паставак прадукцыі ў 34 краіны свету. Традыцыйныя пастаўкі, акрамя вектарных, ажыццяўляюцца ў В'етнам, Польшчу, Прыднястроўе, Грузію, Малдову, Кітай, Чылі, Балгарыю, Арменію, Туркменістан. Прадпрыемства асвоіла новыя рынкі збыту (Венесуэла, Перу, Дамініканская Рэспубліка, Нігерыя, Ірак, Індыя).

У Турцыі «крышталеўская» прадукцыя карыстаецца асаблівай папулярнасцю ў рускіх турыстаў.

— Работа працягваецца, — рэзюмуе Алег Прохараў. — І ў 2013 годзе мы плануем адзначыць свой 120-гадовы юбілей выхадам у сусветныя брэнды на міжнародным рынку. Задача мінімум — за гэты год выйсці на рубеж як мінімум 50 краін. Акрамя таго, ставім перад сабой мэту распрацаваць і ўкараніць універсальны дызайн, які б адказваў інтарэсам усяго свету.

На павышэнне экспартнага патэнцыялу і канкурэнтаздольнасці прадпрыемства накіравана і работа па ахове і кіраванні інтэлектуальнай уласнасцю, якая адзначана на высокім узроўні. Так, па выніках рэспубліканскага конкурсу «На лепшую арганізацыю вынаходніцкай дзейнасці і кіраванне інтэлектуальнай уласнасцю» ў намінацыі «Арганізацыя, якая ажыццяўляе вытворча-камерцыйную дзейнасць» РУП «Мінск Крыштaль» было прызнана пераможцам і ўзнагароджана дыпломам.

— Мы працягнем сваю работу ў гэтым кірунку, — адзначыла **галоўны спецыяліст па патэнтнай і вынаходніцкай рабоце прадпрыемства «Мінск Крыштaль» Тамара ЛІСОЎСКАЯ**. — У прыватнасці, будзем і надалей патэнтаваць за мяжой таварныя знакі нашага прадпрыемства, якія выкарыстоўваюцца на прадукцыі, што ідзе на экспарт. Будзем праводзіць аналіз з пункту гледжання сусветнай навізны — на прадмет магчымасці атрымання патэнтнай аховы на прадукцыю, якая выпускаецца на новых рэцэптурах. Каб павялічыць канкурэнтныя перавагі прадукцыі, праводзіцца работа для размяшчэння брэндавых таварных знакаў РУП «Мінск Крыштaль» («Два буслы», лагатып «Мінск Крыштaль 1893») на этыкетках, індывідуальнай упакоўцы, а таксама рэкламнай і паліграфічнай прадукцыі. Гэтыя і іншыя захады будуць спрыяць паспяховаму прасоўванню прадукцыі прадпрыемства як на ўнутраным, так і на знешнім рынках.

Начальнік аддзела знешнеэканамічнай дзейнасці Алег ПРОХАРАЎ.

Кантроль якасці пачынаецца з поля

У састаў РУП «Мінск Крыштaль» уваходзяць 5 адасобленых структурных падраздзяленняў: Урэчскі, Бярэзінскі і Хатаўскі спіртавыя заводы, Любанскі і Сноўскі крухмальныя заводы, а таксама сельскагаспадарчы вытворчы філіял «Туча», які размяшчаецца ў Клецкім раёне. Таму, можна сказаць, адбор і кантроль за якасцю сыравіны, якая выкарыстоўваецца для вырабу канечнай прадукцыі, пачынаецца ўжо з поля.

СВФ «Туча»далучаны да РУП «Мінск Крыштaль» у 2004 годзе. За гэты час гаспадарка дасягнула значных паказчыкаў як у жывёлагадоўлі, так і ў раслінаводстве.

— Дастойных, на мой погляд, паказчыкаў мы дасягнулі з дапамогай інвестара, які за час далучэння ўклаў 32 млрд руб., — распавядае **дырэктар СВФ «Туча» РУП «Мінск Крыштaль» Сяргей УРБАНОВІЧ.** — Гэтыя грошы пайшлі ў тым ліку на рэканструкцыю бульбасховішча і фермы. Летась завершана рэканструкцыя МТФ «Дунайчыцы», куды закуплена абсталяванне на суму 2,5 млрд рублёў. У ліпені мінулага года адбылося ўрачыстае адкрыццё новага сучаснага бульбасховішча на 1,5 тысячы тон бульбы, у рэканструкцыю якога РУП «Мінск Крыштaль» уклала 6 млрд руб.

Паводле слоў Сяргея Урбановіча, галаўное прадпрыемства дапамагло закупіць і ўвесь шлейф машын для вырошчвання, уборкі, сарціроўкі, загрузкі і адгрузкі бульбы. Трэба адзначыць, што гэтая тэхніка менавіта айчыннай вытворчасці, распрацавана НАН Беларусі.

— Укладзеныя за апошнія 8 гадоў сродкі, — працягвае кіраўнік філіяла, — ужо пачынаюць даваць аддачу. Мы і ў далейшым будзем старацца самі сябе акупляць, не быць нахлебнікамі ў свайго інвестара.

Сучаснае бульбасховішча разлічана на 1,5 тысячы тон бульбы.

«З такіх вось цялят вырастае карова, якая дае 30 літраў малака ў дзень», — адзначыў дырэктар СВФ «Туча» РУП «Мінск Крыштaль» Сяргей УРБАНОВІЧ.

Падчас наведвання аднаго з адасобленых структурных падраздзяленняў РУП «Мінск Крыштaль» — Хатаўскога спіртзавода — давялося падзівіцца і на сучаснае збожжасховішча.

— Пабудавалі гэтае збожжасховішча з дапамогай нашага інвестара вельмі хутка, — распавядае **дырэктар Хатаўскога спіртзавода Вацлаў РУБЛІК.** — У маі прыступілі, а ў кастрычніку ўжо пачалі загружаць ёмістасці збожжам. Кожная з пяці ёмістасцяў разлічана на 2 тысячы тон. Запуск гэтага комплексу даў магчымасць выключыць выдаткі на захоўванне і ачыстку збожжа, значна знізіць страты пры транспарціроўцы збожжа на склады і са складоў захоўвання. І, што самае галоўнае, палепшыць якасць захоўвання збожжа за кошт магчымасці рэгулявання тэмпературна-вільготнаснага рэжыму захоўвання.

Аналагічнае збожжасховішча, толькі на 12 тысяч тон, было ўведзена ў карыстанне ў канцы студзеня на базе Бярэзінскага спіртавога завода. На чарзе — узвядзенне зернеачышчальна-сушыльнага комплексу на 20 тысяч тон ва Урэччы.

«Сачыць за якасцю збожжа стала значна прасцей. Тэмпература і вільготнасць рэгулююцца з дапамогай камп'ютара», — распавялі дырэктар Хатаўскога спіртзавода Вацлаў РУБЛІК і апаратчык апрацоўкі збожжа Дзмітрый БЕЦЬ.

Прадукцыя для здароўя

Пад маркай «Мінск Крыштaль», акрамя асноўнай прадукцыі «пад градусам», выпускаецца і дадатковая, якую можна ўжываць нават дзецям. Гэта крышталь-на чыстая вада, чыпсы, сага, кісель і крухмал. Увесь асартымент натуральнай і карыснай для здароўя прадукцыі вы знойдзеце ў фірменных крамах прадпрыемства. Ніжэй падрабязней спынімся на кожнай з іх.

Пітная вада «Крыштaль»

На тэрыторыі РУП «Мінск Крыштaль» знаходзіцца артэзіянская свідравіна глыбінёй 290 метраў, з якой здабываецца вада. Яна, сцвярджаюць спецыялісты, сама па сабе адменнай якасці, але нават самую лепшую ваду прыроднага паходжання можна дадаткова палепшыць і ўдасканаліць. Што, уласна кажучы, і робіцца супрацоўнікамі РУП «Мінск Крыштaль».

— «Крыштaлеўская» вада дадаткова праходзіць апрацоўку крэменем і серабром, — распавядае **намеснік начальніка аддзела галоўнага тэхнолага Наталля БАРАНОЎСКАЯ.** — У выніку яна набывае якасці крынічнай і, як паказваюць лабараторныя даследаванні, становіцца не проста смачнай, мяккай, але і вельмі карыснай для арганізма чалавека. Мы ганарымся, што зрабілі крыштальна чыстую ваду даступнай. Варта адзначыць, што наша вада рэкамендавана для ўжывання Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

У невялічкім цэху, дзе і наладжана вытворчасць пітной вады, нас сустрэла **начальнік цэха № 3 Святлана ПАНАМАРОВА.** Яна паказала лінію па разліве пітной вады ў бутэлькі.

— Негазіраваную ваду мы разліваем у бутэльку ёмістасцю 0,5, 1 і 6 літраў. Сяроднегазіраваную — у бутэлькі ёмістасцю толькі 0,5 і 1 літр. Наша вада, аўтарытэтна заяўляю, вельмі добрай якасці, смачная. А пасля таго, як завод закупіў установку па азаніраванні вады, тэрмін прыдатнасці нашай вады павялічыўся з месяца да 180 сутак.

У перспектыве, як адзначыў гендырэктар прадпрыемства, плануецца пашырыць цэх, і, магчыма, нават укараніць дадатковую лінейку вады пад пазнавальнай маркай «Мінск Крыштaль».

Прыгатаванне вады адбываецца пад пільным вокам намесніка начальніка аддзела галоўнага тэхнолага Наталлі БАРАНОЎСКАЙ.

Пра сацыяльныя гарантыі і фізкультурна-аздараўленчую работу

На свае вочы пераканаліся, што адміністрацыяй прадпрыемства надаецца вялікая ўвага не толькі вытворчым, але і сацыяльным пытанням. У прыватнасці, праведзена рэканструкцыя заводскага кафетэрыя, у выніку чаго павялічылася колькасць пасадачных месцаў для прыёму ежы. А для тых, хто жадае перакусіць «ссабойкай», у вытворчых карпусах ёсць памяшканні для прыёму ежы, абсталяваныя халадзільнікамі і мікрахвалёўкамі.

— Гарачае харчаванне работнікаў арганізавана шляхам дастаўкі абедаў па іх заказах, — распавядае **начальнік фізкультурна-аздараўленчага комплексу Валянцін НАВАГРОДСКІ.** — Больш за тое, кошт харчавання часткова кампенсуецца ўсім работнікам.

Клапоціцца кіраўніцтва РУП «Мінск Крыштaль» і пра сваіх былых работнікаў.

— У нас больш за 400 пенсіянераў, з іх 77 ганаровых ветэранаў і ветэранаў прадпрыемства, — працягвае Валянцін Навагродскі. — Восенню мы разам з актывістамі грамадскіх арганізацый «Белая Русь» і «БРСМ» бясплатна даставілі ветэранам на дом па 100 кілаграмаў бульбы, якую вырасціў наш філіял «Хмара».

На прадпрыемстве працуюць таксама стаматалагічны і фізіятэрапеўтычны кабінеты, дзе высокакваліфікаваныя спецыялісты бясплатна на сучасным абсталяванні абслугоўваюць работнікаў і іх непаўналетніх дзяцей, а таксама пенсіянераў. У фізіятэрапеўтычны кабінет закуплены масажны ложак, які, паводле слоў медработніка, карыстаецца павышаным попытам.

— Плануем у перспектыве заключыць дагавор з паліклінікай, якая знаходзіцца побач, каб работнікі маглі па медыцынскім накіраванні медыка атрымліваць там за кошт прадпрыемства поўны спектр медыцынскіх паслуг, — дадаў Валянцін Янавіч.

Ёсць на заводзе і моцная каманда спартсменаў, якая ўдзельнічае практычна ва ўсіх спаборніцтвах як раённага, так гарадскога і рэспубліканскага ўзроўню.

— Неаднаразова нашы спартсмены займалі першыя месцы ў такіх відах спорту, як міні-футбол, настольны тэніс, падыманне гіры, плаванне, — працягвае Валянцін Навагродскі. — У нас на заводзе працуе і майстар спорту па плаванні Ірына Важнік. Гэтая таленавітая жанчына заўсёды прыносіць заводу прызавыя месцы. Актыўныя ўдзельнікі спартыўных спаборніцтваў, згодна з калектыўным дагаворам, заахвочваюцца матэрыяльна: узнагароджваюцца грашовай прэміяй, каштоўнымі падарункамі.

Варта адзначыць, што фізкультурна-аздараўленчы комплекс, які знаходзіцца на тэрыторыі завода, абсталяваны сучасным спартыўным абсталяваннем. Усе работнікі (у тым ліку і былыя), члены іх сем'яў могуць наведваць у вольны ад працы час саўну, паплаваць у басейне з вадаспадам і падводным масажам, пазаймацца ў спартыўнай і трэнажорнай залах, пагуляць у настольны тэніс і більярд.

— Мужчыны ахвотна наведваюць трэнажорную залу, жанчыны займаюцца шэйпінгам, — кажа **метадыст фізкультуры, майстар-спорту па самба Гарнік ЕГАЯН.** — Для дзяцей работнікаў працуе фізкультурна-аздараўленчая секцыя. Я сам асабіста з імі займаюся. І гэта цудоўна, бо бацькі ведаюць, што іх дзеці знаходзяцца ў спартыўнай зале ці басейне, а не бадзяюцца недзе.

Адміністрацыя прадпрыемства не на словах, а на справе клапоціцца пра сваіх работнікаў. На РУП «Мінск Крыштaль» дзейнічае калектыўны дагавор, які заключаецца паміж прафсаюзнай арганізацыяй і наймальнікам. Гэты дакумент з'яўляецца гарантам у тым ліку сацыяльнай абароны работнікаў і павышэння ўзроўню іх матэрыяльнага дабрабыту. На працягу года ў дагавор уносяцца змяненні і дапаўненні. Так, у прыватнасці, летась былі ўнесены дапаўненні, згодна з якімі пры нараджэнні дзіцяці аказваецца дапамога не толькі маці, але і тату, які працуе на прадпрыемстве, у памеры 20 б. в. Работнікі, якія пражываюць у інтэрнатах, могуць таксама разлічваць на дапамогу прадпрыемства: ім, згодна з калектыўным дагаворам, часткова кампенсуюцца выдаткі на пражыванне.

Стаматалагічны кабінет абслугоўвае не толькі работнікаў, але і іх непаўналетніх дзяцей, а таксама пенсіянераў.

Паплаваць у басейне з вадаспадам і падводным масажам можа кожны супрацоўнік прадпрыемства.

Безбялковая дыета з сага

РУП «Мінск Крыштaль» — адзінае прадпрыемства ў Беларусі, якое вырабляе сага. Сага — гэта крупы, не толькі смачныя, але і карысныя. Па сваёй пажыўнай каштоўнасці і засваяльнасці сага па праве адносяць да самых неабходных дыетычных прадуктаў. Яно карыстаецца попытам у людзей, асабліва старэйшага пакалення, якія прытрымліваюцца безбялковай дыеты. Таксама яго карысна ўключаць у рацыён харчавання дзяцей для паляпшэння развіцця і росту арганізму.

Сага — асноўны прадукт харчавання ў Новай Гвінеі. Праўда, там гэтыя крупы вырабляюцца з крухмалу, які здабываюць са ствала сагавай пальмы. У якасці сыравіны для вытворчасці гэтага прадукту спецыялісты Сноўскага крухмальнага завода выкарыстоўваюць кукурузны крухмал. Белыя матавыя шарыкі дыяметрам да 3 міліметраў падчас варкі павялічваюцца ў два-тры разы. А паколькі самі па сабе крупы не маюць уласнага смаку, колеру і паху, яны лёгка паддаюцца розным спосабам араматызацыі (ваніль, карыца і інш.) З сага можна гатаваць кашы, выкарыстоўваць як начынку для пірагоў, пудынгаў, фаршыраваць ім рыбу, а таксама запраўляць суп. Дадаючы ў свой рацыён гэтыя крупы, чалавек не толькі атрымлівае карысную ежу, але і забяспечвае свайму арганізму здароўе на доўгія гады.

І чыпсы могуць быць карыснымі!

Бульбяныя чыпсы «Беларускія», «Сталічныя», «Асаблівыя» з кропам, «Асаблівыя» з цыбуляй вырабляюцца выключна з натуральных інгрэдыентаў: сухога бульбянога пюрэ, крухмалу або іх сумесі з натуральным бульбяным пюрэ, здробненым высушаным кропам або цыбуляй. Хрумсткая «бульба» вырабляецца ў невялікіх цэхах на Любанскім і Сноўскім крухмальных заводах.

— Нашы чыпсы вельмі карысныя, з кансервантаў там толькі соль, — адзначае Наталля Бараноўская. — І па кошце яны дастаткова прымальныя. Людзі старэйшага пакалення і замежныя турысты з задавальненнем набываюць нашу натуральную прадукцыю, а вось дзецям «падавай» бліскучую абгортку. Таму ў планах — змяніць дызайн упакоўкі, зрабіць яе больш прыцягальнай.

Матэрыял падрыхтавалі Надзея ДРЫЛА, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Надзеі БУЖАН.

Ліцэнзія № 03220/8 дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі РБ ад 24.05.2010 г. на пяць гадоў. УНП 600013329

ПРАЗМЕРНАЕ ЎЖЫВАННЕ АЛКАГОЛЮ ШКОДЗІЦЬ ЗДАРОЎЮ

■ Формула ўдачы

АПАВЯДАННІ ЯК ЛЮСТЭРКА ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ

Менавіта такім бы хацелася бачыць наш конкурс. Каб ён не толькі даваў месца для адлюстравання нейкіх чалавечых, жыццёвых гісторый, у якіх ёсць нейкая «разынка». А каб ён даваў адчуванне стану, магчымага развіцця сучаснай беларускай літаратуры як мастацтва слова. Ці не надта амбітна для штодзённай газеты, якая павінна быць больш набліжана да людзей?..

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Напэўна, усё ж — не. Таму што літаратура — гэта люстэрка жыцця. Яно дапамагае адчуць вобраз гэтага жыцця, яго балючыя кропкі, людзей, якія нечым жывуць і нечым заклапочаны. Пасля абвяшчэння вынікаў конкурсу сёлета многія нашы пастаянныя чытачы і нават аўтары выказваліся: «Надта складаныя апавяданні ў вас сёлета адзначаны...» А як жа інакш: жыццё ж наогул — складаная з'ява, ці можа быць простай форма выказвання пра яе? І калі мы абвяшчаем літаратурны конкурс, то маецца на ўвазе, што творы, якія паступаюць на яго, будуць мець дачыненне да літаратуры. Гэта не значыць, што такія творы могуць стварыць толькі літаратары, для якіх гэтая праца стала прафесіяй. Бываюць выпадкі, калі сапраўды твор ствараюць аўтары, якія з'яўляюцца чытачамі газеты, калі ім нешта сапраўды баліць і вельмі хочацца выказацца. Сярод нашых чытачоў шмат тых, хто піша і актыўна дасылае апавяданні на конкурс «Звязды» (сёлета іх паступіла каля 40). І сярод нашых аўтараў і чытачоў ёсць людзі, якія з дапамогай гэтага конкурсу (год ад года працуючы над сабой) сапраўды растуць і вырастаюць у самастойную творчую асобу, працягваюць пісаць па-беларуску, выдаюць кніжкі.

Прыемна, што сёлетнія лаўрэаты — асобы сапраўды адметныя. Пераможца Марына Яўсейчык як аўтар літаратурнага твора дэбютавала менавіта на нашым конкурсе, будучы яшчэ школьніцай. А сёння, ужо скончыўшы Інстытут журналістыкі, яна працягвае пісаць у асаблівай творчай манеры, як яна сама кажа, «рытмічную прозу», якая прагучала ў апавяданні «Сейбіт». І сапраўды, паспрабуйце пачытаць яго ўслых: вам будзе падавацца, што гэта нечым нават падобна да верша! І пры тым створаны вобраз, які хочацца развіць у сваім уяўленні. Галоўны рэдактар «Звязды» Алесь Карлюкевіч, вітаючы пераможцу, адзначыў: «І па змесце, і па форме гэтае апавяданне нечакана ў сённяшнім часе. Чытаючы яго яшчэ на стадыі падрыхтоўкі да друку, я думаў пра такіх пісьменнікаў, як Гарэцкі, Брыль, Сцяпан... Шмат ёсць у асобных радках нечага нявыказанага, тое, што можна дадумаць і дадумаць не прамалінейна, а з нейкай асалодай. Мне здаецца, гэта вельмі сур'ёзнае апавяданне.»

Вельмі сур'ёзнае і актуальнае апавяданне «Дом» Уладзіміра Сцяпана (якога сёння ведаюць не толькі як літаратара, аўтара кніжак, але і як журналіста газеты «СБ. Беларусь сегодня»). Гэта адзін з тых беларускіх сучасных пісьменнікаў, каго вылучае асаблівы погляд на рэчаіснасць, пазіцыя чалавека і творцы, які існуе ў рэчышчы сучаснага літаратурнага працэсу. Яго апавяданне — прыклад таго, як у малой літаратурнай форме можна пазначыць вялікія праблемы. Аляксандр Вашчанка вядомы нашым чытачам як даследчык, аматар адшукаць у гісторыі тое, чым можна карыстацца сёння ў жыцці (праз рубрыку, якая прадстаўляе рэцэпты кулінарнай даўніны). І ён напісаў твор «Апошняе паляванне Марэны», кранаўшы тэму гістарычную, але для Беларусі ўсё яшчэ балючую, тую, якая ў беларускай літаратуры займае асаблівае месца. Апавяданне «Брат» Навума Гальпяровіча, якое адзначана спецыяльным дыпломам, таксама прыцягнула ўвагу: рэалістычнасцю, у якой адчувалася перажытае і перадуманае...

Вядучы конкурсу пісьменнік Алесь Бадак адзначыў: «Насамрэч твораў прыходзіць вельмі многа. Калісьці яшчэ Віктар Казько назваў конкурс апавяданняў «Звязды» «народным конкурсам». Сапраўды, шмат народных апавяданняў, якія перапяваюць ужо тое, што было. Але наша задача — вылучаць адметныя творы. Каб праз іх людзі лепш разумелі, што ёсць літаратура, і што ёсць добрае апавяданне, а што — не вельмі...»

Вось дзеля гэтага лепшыя конкурсныя апавяданні варта выдаваць у выглядзе зборнікаў. Гэтую ідэю хоча падтрымаць «Звязда». Пра гэта гаварыў і Алесь Карлюкевіч: «З 2005 года, калі зборнік апавяданняў быў падрыхтаваны выдавецтвам «Мастацкая літаратура», «анталогій» апавяданняў «Звязды» не выходзіла. Гэта трэба паправіць, таму што за апошнія гады ў газеце друкаваліся вельмі цікавыя апавяданні. Такая «анталогія» апавяданняў, якія ўдзельнічалі ў гэтым конкурсе, можа выйсці ўжо ў Выдавецкім доме «Звязда». Ёсць давер густу вядучага, які вылучыць лепшыя творы. Можа быць у зборніка і прадмова — каб захаваць культуру зносін з чытачамі».

А можа, неўзабаве і хто з нашых лаўрэатаў захоча выдаць сваю кніжку праз «Звязду»: вось Марына Яўсейчык сказала, што мае ўжо шмат новых твораў, надта з ахвотай і плённа ёй пішацца. Можа таму, што на роднай мове? Пра гэта разважалі нашы лаўрэаты, калі размова паступова перайшла ў разрад дыскусіі: ці могуць конкурсы стымуляваць літаратурную творчасць? У кожнага з нашых пераможцаў ёсць свой адказ на гэтае пытанне.

Уладзімір Сцяпан:

— Усё, што робіцца па-беларуску, ужо працуе на адраджэнне і абуджэнне. На нейкі рост. А конкурс і чытача прываблівае, і тых, хто ў ім удзельнічае. Кожны ўдзельнік думае: «На гэты раз я не перамог, але ж на наступны раз я магу перамагчы. Я напішу наступнае апавяданне, яно будзе яшчэ лепшае, я займу першае месца». Месца абсалютна не важнае, але прыемна быць першым.

Марына Яўсейчык:

— Маё першае апавяданне, якое было надрукавана на старонках «Звязды», я падрыхтавала не для конкурсу. Яно проста было напісана і два гады ляжала. Маці параіла апублікаваць — а тут у «Звяздзе» абвешчаны конкурс. Было прыемна, што магу паспрабаваць сябе ў літаратурнай дзейнасці, хоць яшчэ і школьніца. Але ў ім было тое, што накіпела, гэта была магчымасць выказацца, даць іншым пачытаць. Таму што на роднай мове мне пішацца заўжды «смачна», бо патрэбна слова, якое б гучала, каб можна было яго смакаваць, каб яно не было посным і сырым. А калі ідзе ад душы і на роднай мове, дык з больш моцнай сілай гучыць.

Аляксандр Вашчанка:

— У мяне была спроба паўдзельнічаць у «звяздоўскім» конкурсе апавяданняў у той год, калі ў ім Іван Шамякін удзельнічаў. Але тагачасны вядучы Віктар Казько вырашыў, што маё апавяданне занадта слёзнае, і яго не надрукавалі. З'явіўся стымул даказаць самому сабе і іншым, што на нешта ты здатны. Таму я лічу, што конкурс стымулюе і аўтараў, і чытачоў таксама.

Навум Гальпяровіч, літаратар, дырэктар радыёстанцыі «Беларусь»:

— Я ўзгадваю, як яшчэ ў Ленінградзе зайшоў у часопіс «Нева» і Усевалад Раждественскі, вядомы расійскі савецкі пісьменнік, сказаў: «Вы ж з Полацка. А ў Полацку, напэўна, трэба пісаць па-беларуску». Гэта сказаў чалавек, які, напэўна, адчуваў, што родная зямля дае тое сапраўднае слова, якое лепш выкажа думкі і пачуцці. І калі я знаёмлюся з творамі Марыны, і калі ведаю, што гэта яшчэ зусім малады чалавек, то мне прыемна, што яна піша і даказвае: і маладым людзям патрэбна беларуская мова, і наша літаратура развіваецца, і ў яе ёсць будучыня. А што тычыцца ўдзелу ў конкурсах, то, нягледзячы ні на званні, ні на ўзрост, у конкурсах трэба ўдзельнічаць, каб праверыць сябе, прайсці незалежную экспертызу. Каб бачыць, што на самой справе ёсць тое, што ты напісаў. Думаю, што конкурсы, фонды і прэміі — гэта справа, якая стымулюе развіццё літаратуры.

Ларыса ЦІМОШЫК

Купала на кітайскай... у Вільнюсе

У сталіцы Літвы адзначылі 100-годдзе «Паўлінкі»

У мінулую нядзелю, 27 студзеня, у Вільнюсе прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя 100-годдзю першай пастаноўкі п'есы «Паўлінка» народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Арганізатарамі гэтых мерапрыемстваў выступілі Міністэрства культуры Беларусі і Пасольства Беларусі ў Літве.

Імпрэзы пачаліся цырымоніяй замены мемарыяльнай дошкі Янкі Купалы на доме па адрасе: вул. Вільняус, 14. У 1914—1915 г. тут размяшчалася рэдакцыя вядомай беларускай газеты «Наша ніва». Тут жыў і тагачасны яе рэдактар — малады Янка Купала.

Стараннямі пасольства Беларусі ў Літве і пры падтрымцы мэрыі Вільнюса і міністэрства культуры Літвы, старая мемарыяльная дошка была заменена на больш сучасную (беларускія скульптары Сяргей Аганаў і Вольга Нячай). На адкрыцці выступілі пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын, віцэ-міністр культуры Літвы Эдвард Трусевіч і намеснік міністра культуры Беларусі Тадэвуш Стружэцкі.

Амаль 100 гадоў таму ў Вільні Янка Купала пазнаёміўся з будучай жонкай — Уладзіславай Станкевіч, і з актрысай Паўлінай Мядзёлкай, у гонар якой назваў гераіню сваёй першай п'есы — камедыі «Паўлінка». Тут ён напісаў вядомыя вершы «Маладая Беларусь», «Заклятая кветка», «Адцьвітаньне»...

Упершыню спектакль «Паўлінка» быў пастаўлены ў Вільні 27 студзеня 1913 г. Дом, у якім сыгралі спектакль, захаваўся да гэтага часу. Цяпер тут — Вільнюскі дом настаўнікаў.

— Мы вельмі ганарымся, што працуем у такім гістарычна значным будынку. Таму з радасцю пагадзіліся прыняць беларускіх сяброў, якія прыехалі адзначыць 100-годдзе спектакля, — сказала карэспандэнту «Звязды» дырэктар Вільнюскага дома настаўнікаў Зіта Жэпніцкіене.

Беларускія культурныя мерапрыемствы працягнула выстава «Не загаснуць зоркі ў небе». На яе стэндах прадстаўлена мноства каштоўных артэфактаў надзвычай плённых у жыцці і творчасці Янкі Купалы віленскіх гадоў. Перш за ўсё гэта чарнавікі, эскізы, накіды да спектакля, аўтографы вершаў, асобнікі газет, кніг і календароў, да выдання якіх меў дачыненне паэт. Моманты сяброўскіх і творчых сустрэч Янкі Купалы з выдатнымі асобамі беларускага і літоўскага культурнага жыцця таго часу адлюстроўваюць дакументы, успаміны і мастацкія творы.

Тут жа, ва ўтульнай зале дома настаўнікаў, госці выставы прачыталі на сваіх родных мовах вершы беларускага паэта. Задумка пасольства Беларусі ў Літве ўдалася на славу. Не кожны дзень зможаш паслухаць, як гучаць вершы Янкі Купалы на розных мовах свету. Тым больш калі іх на сваёй роднай мове чыталі не акцёры або прафесійныя чытальнікі, а замежныя госці — афіцыйныя паслы Кітая, Украіны, Азербайджана, саветнікі пасольстваў Расіі і Малдовы. Купалу на літоўскай прачытаў саветнік прэм'ера Літвы Фаустас Латэнас.

Святочныя мерапрыемствы завяршыліся канцэртам фальклорнай групы «Купалінка» Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Ён прайшоў з вялікім поспехам, пры поўнай зале.

— Прыемна, што ў той жа зале, дзе 100 гадоў таму была прадстаўлена «Паўлінка», зараз мы можам парадавацца выступленнем «Купалінкі» па матывах спектакля, — дзяліўся ўражаннямі з карэспандэнтам «Звязды» пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын. — Мы рады, што праз 100 гадоў маем магчымасць адзначыць святочную дату на гасціннай вільнюскай зямлі.

На ўрачыстасці ў якасці гасцей былі запрошаны кіраўніцтва і супрацоўнікі Міністэрства культуры Беларусі, літоўскіх міністэрстваў і ведамстваў, паслы і дыпламаты замежных пасольстваў, культурныя і грамадскія дзеячы, прадстаўнікі беларускай дыяспары і нацыянальных абшчын Літвы, літоўскія бізнэсмены, пісьменнікі і журналісты.

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС, уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве. Фота аўтара.

г. Вільнюс.

На фотаздымках:

Новая мемарыяльная дошка Янкі Купалы. Аўтары — беларускія скульптары Сяргей Аганаў і Вольга Нячай.

На адкрыцці новай мемарыяльнай дошкі Янкі Купалы выступае пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын.

На сваёй роднай мове верш Янкі Купалы чытае пасол Кітая ў Літве Зенгвен Лю.

■ Здарэнне

Падпалілі дэбаркадар

Сярод белага дня загарэўся двухпавярховы драўляны дэбаркадар, прышвартаваны на востраве ля берага Сожа. Баржа, якая належыць індывідуальнаму прадпрымальніку, не эксплуатавалася з 2011 года. Пажар быў лакалізаваны выратавальнікамі, але знішчаны металічны дах і другі паверх.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Інфарм-укол

ПРАЦУЙЦЕ НАД ДЗІЦЯЧЫМ ІМУНІТЭТАМ

Дзеці, якія часта хварэюць на вострыя рэспіраторныя інфекцыі, сёння не рэдкасць. Аднак, сам па сабе тэрмін «дзеці, якія часта хварэюць», — не захворванне і не дыягназ. У кожным канкрэтным выпадку неабходна высвятляць прычыну частых рэспіраторных інфекцый, паколькі ад гэтага залежыць комплекс мерапрыемстваў рэабілітацыйнай праграмы.

Для ўсіх вострых рэспіраторных вірусных інфекцый — грыпу, парагрыпу, адэнавіруснай, рынавіруснай, рэавіруснай, каранавіруснай —характэрна непрацяглая ліхаманка і інтаксікацыя, паражэнне аддзелаў рэспіраторнага тракту, кажа **валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алена ГАРНІЦКАЯ.** Узбуджальнікі ВРВІ — вірусы — пашкоджваюць у асноўным верхнія дыхальныя шляхі (нос, глотку, гартань, трахею), аднак у малых дзяцей падчас эпідэмій інфекцыя «апускаецца» ніжэй, з-за чаго ўзнікаюць бранхіты з пнеўманіямі.

Прычын узнікнення ВРВІ мноства.

1. Значная распаўсюджанасць вірусаў у прыродзе і вялікая колькасць відаў кожнага з іх.

2. Павышаная ўспрымальнасць дзяцей да ўзбуджальнікаў рэспіраторных інфекцый. Адчувальнасць канкрэтнага дзіцяці да розных вірусаў вызначаецца, напрыклад, пасіўным імунітэтам, які маці перадае дзіцяці падчас цяжарнасці і з грудным малаком. Калі ж дзіця знаходзіцца на штучным выкормліванні, то матулінай абароны хапае толькі на першыя 2-3 месяцы жыцця. Потым дзіця становіцца практычна безабаронным перад ВРВІ, паколькі яго ўласная імунная сістэма яшчэ не сфарміравалася.

3. Спадчынная схільнасць (наяўнасць «малых анамалій» імунітэту ад нараджэння).

4. Уплыў неспрыяльных экалагічных і сацыяльных уздзеянняў досыць хутка знясільвае імунную сістэму дзіцяці. Гэта могуць быць самыя розныя забруджвальнікі знешняга асяроддзя, а таксама лекі, пестыцыды і г.д.

5. Псіхаэмацыяльныя перагрузкі, стрэсы.

6. Нерацыянальнае харчаванне.

7. Недахоп вітамінаў і мінералаў.

8. Сацыяльная і эканамічная нестабільнасць сям'і.

9. Хранічныя ачагі інфекцыі (хранічны танзіліт, адэноіды, карыес і г.д.), што напружвае імунную сістэму і прыводзіць да новых імунадэфіцытных станаў, спрыяе хранізацыі віруснай, часцей герпетычнай, інфекцыі.

Крыніца інфекцыі, як вядома, хворы чалавек. Максімальнай колькасцю вірусаў ён дзеліцца з навакольнымі першыя 2-3 дні. Аднак пры няўскладненым стане хворы небяспечны ў сэнсе заражэння да 7-га дня, а пры ўскладненым — да 14-га. Для дзяцей крыніцай інфекцыі могуць быць дарослыя, якія пераносяць захворванне «на нагах». Вірусаносьбітамі становяцца таксама дзеці з хранічнымі ачагамі інфекцыі, паколькі ў выпадку захворвання яны больш працягла выдзяляюць вірусы.

Шлях перадачы ВРВІ — паветрана-кропельны. Падчас чхання, кашлю, а таксама з выдзяленнямі з носа вірусы з дыхальных шляхоў трапляюць у паветра, а далей у органы дыхання іншых людзей.

З усіх ВРВІ найбольшую небяспеку для дзіцячага арганізма ўяўляе грып. Ён пачынаецца раптоўна, і першай прыкметай з'яўляецца павышэнне тэмпературы цела. У першыя ж гадзіны яна дасягае 39-41 градуса і трымаецца некалькі дзён. У дзяцей першага году жыцця павышэнне тэмпературы можа суправаджацца рвотай. Для грыпу характэрныя і такія прыкметы, як моцны галаўны боль, слёзацячэнне, боль у мышцах, горле, закладзены нос, сіплы голас, агульнае дрэннае самаадчуванне. Пазней можа быць і сухі кашаль, які праз 2-3 дні становіцца вільготным.

У дзяцей груднога ўзросту тэмпература пры грыпе дасягае максімуму на другія суткі захворвання, суправаджаецца неспакоем, раздражняльнасцю, парушэннем сну, адмовай ад груднога кармлення, пакашліваннем. Дзіця дыхае паўадкрытым ротам. Нярэдка ўспушваецца жывот, стул часты і вадкі.

Усе ВРВІ не такія і небяспечныя пры своечасовым лячэнні. У процілеглым выпадку могуць быць ускладненні, якія перарастуць у хранічную форму. Ускладненні ў першую чаргу датычацца органаў дыхання. 60% ускладненняў складаюць пнеўманіі, паражэнні нервовай сістэмы (энцэфаламіеліты), паталогія ЛОР-органаў, запаленне сардэчнай мышцы.

Лячэнне ВРВІ пры няўскладненых формах хоць і ажыццяўляецца ў хатніх умовах, але пры строгім выкананні рэкамендацый лечачага ўрача.

✓ Павінен быць спакойны паўложкавы рэжым пры рэгулярным праветрыванні таго пакоя, у якім знаходзіцца хворы.

✓ Цёплае піццё (не менш за 2 л у суткі) — лепш багатае на вітамін С (чай з лімонам, настой шыпшыны, морс).

Найлепшай сістэмай прафілактыкі ВРВІ ў дзяцей, якія часта хварэюць, з'яўляецца «работа над стойкім імунітэтам». Гэтаму спрыяюць:

— здаровы лад жыцця

— рэжым дня

— паўнацэннае харчаванне

— разнастайныя праграмы загартоўвання

— абмежаванне кантактаў з хворымі на ВРВІ

— вытрымліванне элементарных санітарна-гігіенічных нормаў

— зручнае, адпаведнае ўмовам надвор'я, адзенне

— пазбаўленне пасіўнага курэння

— санацыя хранічных ачагоў інфекцыі (танзіліту, адэнаідыту, карыесу і інш.)

— прафілактычныя прышчэпкі

— выкарыстанне адаптагенаў па рэкамендацыі ўрача.

Сістэматычнае кантраснае паветранае або воднае загартоўванне павышае ўстойлівасць арганізма да хістанняў тэмпературы навакольля і імунную рэакцыю. Загартоўванне не патрабуе вельмі нізкіх тэмператур, тут важная кантраснасць уздзеяння і сістэматычнасць. Максімальнае дзеянне загартоўкі не павінна перавышаць 10-20 хвілін. Такія працэдуры добра спалучаць з гімнастыкай і масажам грудной клеткі.

Часам рэкамендуецца выкарыстанне такіх раслін, як кітайскі лімоннік, элеутэракок, жэньшэнь, эхінацэя, леўзея.

Паколькі нярэдка ўзнікае пытанне аб магчымасці і мэтазгоднасці правядзення каляндарнай вакцынацыі або грыпознай прышчэпкі, то варта сказаць асобна: спецыяльнымі даследаваннямі было даказана, што вакцынацыя дзяцей, якія часта хварэюць, з'яўляецца адным з самых важных прафілактычных мерапрыемстваў.

Святлана БАРЫСЕНКА

Юрый ЛЕДНІК:

■ Медыяперсона

«МНЕ ЎЛАСЦІВА НЕ ЗАЙЗДРАСЦЬ, А ІМКНЕННЕ ДА КАНКУРЭНЦЫІ...»

Калі само жыццё падкідвае вам ідэю заваяваць новыя гарызонты, то чаму б ёю не скарыстацца? Юрый Леднік на ўласным прыкладзе даказаў, што нават рэзкія павароты лёсу бываюць да лепшага. Галоўнае, каб новая справа была стымулам для самаўдасканалення. Сёння ён з'яўляецца намеснікам галоўнага дырэктара Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі, а, здавалася б, яшчэ ўчора Юрый проста дзеля цікавасці зазірнуў на кастынг, дзе набіралі вядучых. З таго часу навіны — стыль яго жыцця. Відаць, калі бярэшся за нейкую справу і хочаш рабіць яе якасна, то інакш немагчыма...

— Юрый, як вы трапілі на тэлебачанне?

— Гэта было ў 2003 годзе. Неяк я ўбачыў аб'яву пра кастынг і вырашыў паспрабаваць. Тады адабралі многіх. Мне сказалі, што мая славянская знешнасць і ўсмешка ім падабаецца. Паабяцалі ператэлефанаваць. Гэта было напрыканцы лютага—пачатку сакавіка. Тады я ўспрыняў гэта проста як падзею, якая мела месца быць... А ў маі мне патэлефанавалі. Я прайшоў курсы вядучых і «заразіўся» тэлебачаннем. У верасні быў прыняты на працу вядучым праграмы «Пастскрыптум». Пісаў тэксты, выязджаў на здымкі. Асвойваў усё з самых азоў.

— Атрымліваецца, што прайшлі шлях ад вядучага да кіраўніка. Калі зараз азірнуцца — якія этапы былі самымі складанымі?

— Дрэнны той салдат, які не марыць быць генералам. Я не магу сказаць, што нейкі этап быў складаным, бо гэта праца. Калі ты робіш яе добра, то абавязкова нечаму вучышся, набіраешся вопыту. І гэта дазваляе расці. Я прыйшоў працаваць і імкнуўся ўдасканальвацца. У мяне не бывае такога, каб я сказаў: гэтага зрабіць не магу і таму сыходжу. Калі ёсць мэта і разуменне, што нейкую справу ты можаш рабіць добра і варты яе, то нельга адступаць.

— Калі прыадкрыць закуліссе тэлевізійнай кухні — якое яно?

— Цікавае. Каб тэлебачанне было цікавым, трэба зрабіць яго такім. Не проста суха падаць тую ці іншую інфармацыю, а знайсці навіну, якая будзе цікавай не толькі табе аднаму, але і іншым. Бо ў любым сюжэце, у любым матэрыяле ёсць аспекты, якія хвалююць тваіх гледачоў. І калі на гэтым зрабіць акцэнты і правільна паднесці, то на навіну звернуць увагу і яе запомняць.

— Вы таксама былі вядучым...

— Са свайго вопыту магу сказаць, што асаблівых сакрэтаў не меў. Важна проста быць адкрытым. Бо ў камеры магічны позірк. Калі ты хлусіш ці нешта ўтойваеш, то гэта абавязкова заўважаць. Варта быць шчырым і аб'ектыўным, каб данесці людзям свае думкі і быць пачутым імі.

— Ці арыентуецеся вы на густы аўдыторыі?

— Трэба разумець, што мы маем справу з навінамі. Мы проста інфармуем нашых гледачоў і імкнёмся рабіць гэта добра.

— Якія з праектаў вы б аднеслі да ўзору ТБ-журналістыкі?

— Я адзначыў бы такія, як «Нашы». Мы паказваем у ім звычайных людзей, якія вартыя таго, каб быць заўважанымі. Напрыклад, як наш трэці беларускі касманаўт Алег Навіцкі. Ці той жа Яўген Літвінковіч, якому не ўдалося знайсці прызнанне ў нашых прадзюсараў, але ён гучна заявіў пра сябе на ўкраінскіх тэлешоу... З гэтага ж шэрагу таксама праграмы «Клуб рэдактараў», «Журналісцкае расследаванне» і «Актуальнае інтэрв'ю». Усе гэтыя праекты цікавыя, яны маюць сваю нішу і развіваюцца на нашых вачах.

— Ці ўласцівая вам прафесійная зайздрасць да калег з іншых каналаў ці краін?

— Не зайздрасць, а імкненне да канкурэнцыі. Я добра ўсведамляю, што, каб прыцягнуць аўдыторыю і ўтрымліваць яе, трэба імкнуцца быць больш цікавым, чым твае калегі па цэху. Кожны канал бярэ нечым сваім: НТБ, напрыклад, серыяламі, Бі-Бі-Сі — навінамі. Мы ж стараемся адпавядаць нашым рэаліям.

— Што глядзіце самі, калі прыходзіце дадому?

— Навіны. Бо, як казаў адзін чалавек, спачатку табе цікава, потым гэта зацягвае, а з часам ты не можаш без гэтага жыць. Я адпачываю ад працы, але мне заўсёды цікава, што пакажуць у навінах. Нават калі прагляд «фонавы». З іншага боку, у паняцце «навіна» можна ўкладваць розны сэнс. Таму я магу паглядзець фільм, даведацца з яго нешта новае, і гэта будзе для мяне навіной.

— Ад чаго, на ваш погляд, залежыць атмасфера ў калектыве?

— Мабыць, ад кіраўніка і ад калектыву ў роўнай ступені. Калі ёсць давер адзін да аднаго і адчуванне, што цябе падтрымаюць у любой сітуацыі. Тады каманда працуе, як зладжаны механізм. Да людзей трэба знайсці падыход. Як той казаў, не бывае дрэннага кіраўніка, бываюць проста непапулярныя кіраўніцкія рашэнні. Важны момант — уменне вырашаць спрэчныя пытанні і адстойваць інтарэсы свае і сваіх супрацоўнікаў.

— Вам камфортна ў ролі кіраўніка?

— Шчыра кажучы, я яшчэ не зразумеў. Мне аказалі давер, і я буду старацца яго апраўдаць.

— А якім трэба быць, калі займаеш кіруючую пасаду?

— Прымаючы нейкае важнае рашэнне, заўсёды бяру прыклад са свайго кіраўніка — абавязкова разглядаю розныя пункты гледжання. Лічу правільным спачатку абмеркаваць пытанне, а ўжо потым прымаць рашэнні. Шукаць, разглядаць розныя варыянты — правіла нашага калектыву. Але калі рашэнне знойдзена, то мы яго рэалізуем.

— Тэлебачанне ўнесла карэктывы ў вашы жыццёвыя прыярытэты?

— Я стараюся, каб у маім жыцці была не толькі праца. Мне важна ўдзяляць час сваёй сям'і, каб мае блізкія бачылі мяне дома. Трэба захоўваць разумны баланс. Маё кіраўніцтва разумее, што, акрамя працы, ёсць яшчэ і сям'я, якая патрабуе майго непасрэднага ўдзелу.

Алена ДРАПКО.
Фота з уласнага архіва Юрыя Ледніка

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

15 февраля 2013 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Инженерная инфраструктура *	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Горанский с/с, д. Великая Борздынь	623681301601000022	0,1200 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	4 581 197	30 000 000	6 000 000
2	Горанский с/с, п. Звенячи	623681306101000071	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	2 704 389	81 000 000	16 200 000
3	Горанский с/с, д. Казаки	623681307601000036	0,1210 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	4 435 727	31 000 000	6 200 000
4	Острошицко-Городокский с/с, д. Околица, участок № 1	623685205601000516	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ	3 000 000	900 000 000	180 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **15.02.2013 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **11.02.2013 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе На Лоты 1–3 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 Горанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лот 4 перечисляется на расчетный счет № 3641000000047 Острошицко-Городокского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600208279, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.
3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.*

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 06 марта 2013 года проводит 3-ий открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка, (бел. руб.)
50	Мастерская передвижная на железнодорожном ходу МХ-М № 38 1990 г. 4 кат. КР-1990 г. в составе: Кузнечный цех – крытый вагон № 20420071 1956 г. Инструментально-механический цех – крытый вагон № 20115895 1956 г. Механический цех № 1 – крытый вагон № 22869937 1956 г. Механический цех № 2 – крытый вагон № 20862207 1956 г. Электросиловой цех – крытый вагон № 20096661 1956 г. Электроремонтный цех – крытый вагон № 20608824 1956 г. Слесарно-сварочный цех – крытый вагон № 20574596 1956 г. Агрегатно-ремонтный цех – крытый вагон № 20020681 1954 г. Авторемонтный цех – крытый вагон № 20032363 1958 г. Цех ремонта дизельных двигателей – крытый вагон № 20748190 1952 г.	г. Слуцк, в/ч 18662	1 950 000 000	195 000 000
51	Мастерская передвижная на железнодорожном ходу МХ-М № 21 1986 г. 4 кат. ДР-1990 г. в составе: Кузнечный цех – крытый вагон № 20681730. Инструментально-механический цех – крытый вагон № 20269114 – Механический цех № 1 – крытый вагон № 20268876 – Механический цех № 2 – крытый вагон № 20268777 – Электросиловой цех – крытый вагон № 20220885 – Электроремонтный цех – крытый вагон № 20268884 – Слесарно-сварочный цех – крытый вагон № 20339560 – Агрегатно-ремонтный цех – крытый вагон № 20260147 – Авторемонтный цех – крытый вагон № 20260030 – Цех ремонта дизельных двигателей – крытый вагон № 20220877. Все вагоны – 1971 г.	г. Слуцк, в/ч 18662	1 620 000 000	162 000 000
52	Тепловоз ЧМЭ-3 № 915 дв. К6С31ОДР № 411009-4203 генератор TD 802 № 1583208 1970 г. 2 кат. пробег 21 год 6 мес.	п. Жодино, в/ч 48848	1 700 000 000	170 000 000
53	Мост автодорожный (шифр ВАР) № 1 1981 г. 2 кат. наработка 0,5 года	п. Жодино, в/ч 48848	1 430 000 000	143 000 000
54	Мост автодорожный (шифр ВАР) № 2 1981 г. 3 кат. наработка 0,5 года	п. Жодино, в/ч 48848	1 430 000 000	143 000 000

Условия проведения аукциона изложены в газете «Звязда» № 9 от 17 января 2013 года.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 14 марта 2013 года проводит 4-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
55	Грузовой КамАЗ-4310 ш. 0028439 дв. 040464 1987 г. 3 кат. 94347 км	г. Брест, в/ч 11921	45 000 000	4 500 000
56	Автошасси Урал-4320-1012 ш. 081777 дв. 133800 1987 г. 4 кат. 53552 км	г. Береза, в/ч 23324	50 000 000	5 000 000
57	Автошасси Урал-4320 ш. 056300 дв. 908977 1986 г. 4 кат. 61110 км	г. Береза, в/ч 23324	50 000 000	5 000 000
58	Грузовой Урал-4320 ш. 053663 дв. 881318 1986 г. 3 кат. 103478 км	г. Слоним, в/ч 33933	40 000 000	4 000 000
59	Грузовой Урал-43202 ш. 104575 дв. 309199 1988 г. 3 кат. 103238 км	г. Слоним, в/ч 33933	40 000 000	4 000 000
60	Грузовой Урал-43202 ш. 028575 дв. 639407 1984 г. 3 кат. 98180 км	г. Слоним, в/ч 33933	40 000 000	4 000 000
61	Грузовой Урал-4320-0011 ш. 079243 дв.110489 1987 г. 3 кат. 116589 км	г. Слоним, в/ч 33933	40 000 000	4 000 000
62	Грузовой Урал-4320-0010 ш. 053146 дв. 872040 1986 г. 3кат. 77491 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
63	Грузовой Урал-4320-0011-01 ш.113187 дв. 357656 1988 г. 3 кат. 112655 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	40 000 000	4 000 000
64	Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 103541 дв. 297921 1988 г. 4 кат. 59346 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	50 000 000	5 000 000
65	Грузовой Урал-43202 ш. 060600 дв. 952578 1986 г. 4 кат. 131024 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	40 000 000	4 000 000
66	Грузовой Урал-4320-0011 ш. 077810 дв. 455602 1987 г. 3 кат. 117122 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
67	Грузовой Урал-4320-0010-01 ш. 167868 дв. 738211 1991 г. 3 кат. 93090 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	50 000 000	5 000 000
68	Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 064873 дв. 977844 1986 г. 3 кат. 98613 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
69	Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 022398 дв. 578407 1984 г. 4 кат. 40180 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	55 000 000	5 500 000
70	Грузовой КамАЗ-43105 ш. 1572 дв. 647839 1984 г. 4 кат. 32415 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	50 000 000	5 000 000
71	Грузовой КрАЗ-250 ш. 583065 дв. 038411 1987 г. 4 кат. 36396 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	40 000 000	4 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, каб. № 637 **14 марта 2013 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 11 марта 2013 года**.

Победитель аукциона обязан:

Заключить договор купли-продажи **14 марта 2013 г.**

Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **10**-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**. **Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс (017) 278 09 98. Наш адрес в интернете: www. belspeckontrakt.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	1.	2.	3.
